ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 35-ы № 49 (2102)

17 чэрвеня 1966 г. ПЯТНІЦА

Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

СУСВЕТНАЯ ВЫСТАЎКА Ў МАНРЭАЛІ

У наступным годзе ў канадскім горадзе Манрэалі будзе наладжана Сусветная выстаўка. У ёй будзе ўдзельнічаць і Савецкі Саюз. Зараз ідзе падрыхтоўка да выстаўкі. Начальнік аддзела знешне-эканамічных сувязей Дзяржплана БССР Пётр Андрэевіч Кудрын паведаміў карэспандэнту газеты «Літаратура і мастацтва»:

— У Сусветнай выстаўцы, як члены ААН, прымуць удзел Беларусь і Украіна. У час выстаўкі будуць праведзены тры дні, прысвечаныя Савецкаму Саюзу. 17 жніўня 1967 года будзе Днём Беларусі. На выстаўку прадстаўляюцца экспанаты, якія раскажуць аб развіцці нашай прамысловасці, навукі, сельскай гаспадаркі і культуры. У Манрэалі з канцэртамі выступяць мастацкія калектывы рэспублікі, будуць дэманстравацца дакументальныя і мастацкія фільмы, якія расказваюць пра Беларусь. Нашы спартсмены прымуць удзел у спартыўных выступленнях. Будуць паказаны вырабы беларускай мастацкай прамысловасці, наладжаны продаж беларускіх сувеніраў, кніг і г. д.

Удакладняецца план правядзення Дня Беларусі. У Пастпрэдстве БССР у Маскве праведзены папярэдні адбор экспанатаў для выстаўкі і тавараў на продаж — мастацкага шкла, керамікі, фарфору, мастацкіх вырабаў з дрэва, саломкі, лёну.

Газета «Літаратура і мастацтва» ў наступных нумарах раскажа аб некаторых мастацкіх вырабах, якія мяркуецца паслаць з Беларусі ў Манрэаль, аб іх стваральніках.

ЛІЧБЫ—СІМВАЛЫ

Так, кожная лічба, змешчаная ў паведамленні Цэнтральнай выбарчай камісіі аб выніках выбараў у Вярхоўны Савет СССР сёмага склікання, — гэта сімвал.

Сімвал нябачанага ў гісторыі любой іншай дзяржавы адзінства.

Сімвал найвышэйшага ўсведамлення мільёнамі і мільёнамі людзей свайго непасрэднага ўдзелу ў кіраўніцтве краінай, сваёй адказнасці за яе сённяшні і заўтрашні дзень.

144.000.973 грамадзяніны СССР былі ўнесена ў спісы выбаршчыкаў. 143.917.031 з іх — 99,94 працэнта! — апусцілі свае бюлетэні ў выбарчыя урны.

У нашай рэспубліцы ў галасаванні ўдзельнічала 99,95 працэнта выбаршчыкаў — 5.459.113 чалавек з 5.461.703 унесеных у спісы.

Выяўленнем найвышэйшага ўсенароднага давер'я кандыдатам блока камуністаў і беспартыйных з'яўляецца той факт, што ва ўсіх выбарчых округах кандыдаты, вылучаныя ў Вярхоўны Савет, атрымалі абсалютную большасць галасоў. Сваё «за» кандыдатам у дэпутаты Савета Саюза сказалі 143.570.976 чалавек — гэта значыць, 99,76 працэнта ад агульнай колькасці выбаршчыкаў, што ўдзельнічалі ў галасаванні. Такія ж пераканаўчыя вынікі выбараў у Савет Нацыянальнасцей.

Цэнтральная выбарчая камісія на падставе артыкула 38 Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Савет СССР зарэгістравала выбранне дэпутатаў Вярхоўнага Савета СССР сёмага склікання па ўсіх 1.517 выбарчых округах. У Савет Саюза выбрана 767 дэпутатаў, у Савет Нацыянальнасцей — 750 дэпутатаў.

Мы да многага прызвычаіліся, многае лічым само сабою зразумелым, быццам так было спрадвеку. Але ўдумайцеся ў склад савецкага парламента. Сярод нашых дэпутатаў — 698 рабочых і калгаснікаў, больш 300 інжынераў і тэхнікаў, каля 200 спецыялістаў сельскай гаспадаркі. У Вярхоўны Савет выбраны любімыя народам пісьменнікі, мастакі, кампазітары, артысты. Ля руля кіравання дзяржавай — сыны і дочкі літаральна ўсіх народаў, што ўтвараюць вялікі Савецкі Саюз.

Перад нашымі дэпутатамі — нямала вялікіх і складаных задач, звязаных з ажыццяўленнем гістарычных рашэнняў XXIII з'езда КПСС. Неўзабаве Вярхоўны Савет СССР новага склікання разгледзіць і прыме закон аб пяцігадовым плане развіцця эканомікі нашай краіны. Гэты грандыёзны план прадугледзіць далейшы буйны крок нашай дзяржавы на шляху да камунізма.

Ад Буга да Камчаткі, ад Паўночнага Ледавітага акіяна да Чорнага мора кіпіць у краіне напружаная стваральная праца. Кожны савецкі чалавек імкнецца ўнесці свой пасільны ўклад у агульную справу. Ён спакойны за сваю будучыню, бо ведае — людзі, якім даручана кіраванне краінай, — дастойныя людзі, усім сэрцам адданыя вялікай справе Леніна.

ЗА МАСТАЦТВА ГЛЫБОКАЙ ПРАЎДЫ

ПЛЕНУМ ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА КІНЕМАТАГРАФІСТАЎ БССР

З высокай трыбуны XXIII з'езда КПСС яшчэ раз было падкрэслена, што кінамастацтва з'яўляецца вастрэйшай зброяй партыі ў яе ідэалагічным арсенале.

Як беларускія кінематаграфісты змагаюцца за выкананне рашэнняў з'езда, з чым ідуць яны да юбілейных дат — 50-годдзя Савецкай улады, 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна, 50-годдзя рэспублікі,—гэтыя пытанні сталі тэмай гаворкі на пленуме праўлення Саюза кінематаграфістаў БССР, які адбыўся 10 чэрвеня.

У поспехах савецкага кіно ёсць і наша, «беларуская» доля. Некаторыя фільмы, выпушчаныя за апошнія гады, адзначаліся на ўсесаюзных і занальных фестывалях, заваявалі прызнанне ў гледачоў. Можна назваць, у прыватнасці, «Маскву — Генуя», «Горад майстроў», «Трэцюю ракету», «Пушчык едзе ў Прагу». Але з беларускай маркай выходзілі і фільмы шэрыя, невыразныя, фільмы, якія мільганулі на экране, не пакінуўшы следу. Гэта «Першы хлеб», «Сорак мінут да світання», «Каханая» і некаторыя іншыя.

Мастацтва — заўсёды пошук, а на дарозе пошукаў могуць быць і няўдачы. Але ці не павінны мы ў імя пленных пошукаў разабрацца ў прычынах такіх няўдач, выявіць заканамернасці іх узнікнення, шляхі папярэджання?

Крытычны пафас многіх выступленняў на пленуме якраз і быў скіраваны на тое, каб ускрыць карэнні недахопаў і памылак у творчасці беларускіх кінематаграфістаў, выявіць прычыны, якія вядуць да выпуску слабых стужак.

— Няма творчасці без адкрытага, прынцыповага, непрадузятага абмену думак, —сказаў рэжысёр В. Тураў. — Аднак у мяне складваецца такое ўражанне, што ў нас на студыі шчырае слова не вельмі любяць. На пасяджэннях рэдакцыйнай калегіі нярэдка панае абстаноўка захвальвання, узаемнай амністыі. Сцэнарый часам запускаюць у вытворчасць без грунтоўнага абмеркавання з рэжысёрамі і іншымі творчымі работнікамі, іх звычайна абыходзяць пры фарміраванні тэматычных планаў. У жыцці калектыву не заняў належнага месца і мастацкі савет студыі. Ён у першую чаргу павінен вызначаць вартасць выкананых работ, несці адказнасць за прадукцыю студыі. А ў нас за членамі савета пакінута толькі права рэкамендацый, з якімі да таго ж ніхто не лічыцца.

Творчыя групы, якія узнікаюць на студыі ў працэсе пастаноўкі фільмаў, працуюць зазвычай адасоблена. З аднаго боку, самі рэжысёры, кіраўнікі груп, супраціўляюцца «ўмяшанню» ў іх «унутраныя справы», з другога — кіраўніцтва студыі не імкнецца наладзіць дзейсны творчы кантроль і дапамогу ім. А, як вядома, атмасфера творчага герметызму, неўмяшання, не спрыяе ўдачы ў рабоце.

Удзельнікі абмеркавання справядліва падкрэслівалі, што поспех любога фільма залежыць ад таго, наколькі ярка і глыбока адлюстравана ў ім праўда жыцця. Агульнавядома, што першаасновай фільма з'яўляецца сцэнарый. А паколькі лёс будучага твора мастацтва непарыўна звязаны з яго драматургіяй, дык і сцэнарная праблема была і застаецца адной з важнейшых. У дакладзе старшыні Камітэта па кінематаграфіі Б. Паўлёнка, зробленым на пленуме, адзначалася, што партфель беларускіх студый за апошні час прыкметна папоўніўся, і ідуць здымкі па новых цікавых сцэнарыях. Але вось з выступленняў удзельнікаў абмеркавання стала ясна, што для лагоднага настрою няма яшчэ важкіх падстаў.

Крытык В. Нячай спынілася на запушчаным у вытворчасць сцэнарыі А. Спешнева «Тысяча вокнаў». Тэма сцэнарыя — выхаванне пралетарскага інтэрнацыяналізму — вельмі актуальная. Але аўтара «Масквы — Генуя», на думку крытыка, на гэты раз напаткала сур'ёзная няўдача. Героі сцэнарыя — прадстаўнікі розных народаў — толькі носьбіты нейкіх умоўных якасцей. Яны не маюць ні індывідуальных рысаў, ні індывідуальных характараў. Ствараецца ўражанне, што аўтар больш заняты фармальнымі пошукамі.

Удзельнікі абмеркавання гаварылі і аб сур'ёзных недахопах сцэнарыя «Саша-Сашанька». Гэта твор без сюжэта, без канфліктаў, без яркіх вобразаў. Драматургічны матэрыял не дае ніякай асновы для цікавай работы, а між тым сцэнарый даручылі маладому рэжысёру, які толькі пачынае свой шлях у мастацтве.

Калі недапушчальныя хібы ў звычайных фільмах, дык тым больш нельга дараваць іх стужкам, якія рыхтуюцца да вялікіх дат, падкрэслівалі прамоўцы. Гэта павінны быць творы сапраўды маштабныя, творы, якія ўзнімуцца да вялікіх ідэйна-мастацкіх абагульненняў. Аднак, як слушна зазначалі В. Тураў, В. Смаль, В. Нячай, той-сёй схільны рабіць скідкі «юбілейным» сцэнарыям «за тэму». Сур'ёзныя недахопы, на думку некаторых таварышаў, ёсць у запушчаных у вытворчасць сцэнарыях «Усходні калідор» і «Радыё — усім, усім». А. Кучар, які выступіў у абарону сцэнарыя «Усходні калідор», не здолеў адвесці ўсіх зробленых яму, як аднаму з аўтараў твора, заўваг.

Шмат увагі пленум аддаў рабоце студыі навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў. Дакументальны кінематограф па самой сваёй прыродзе здольны больш аператыўна адгукацца на «заказы часу», першым выходзіць да новых тэм. Аб планах кінадакументалістаў, іх пошуках і здзяйсненнях гаварылі дырэктар студыі М. Тараткевіч, рэжысёры І. Вейняровіч, С. Прошын, аператар І. Пікман, рэдактар Р. Ясінскі, кінакрытык Г. Ратнікаў. Студыя выпускіць сёлета каля ста частак фільмаў. Многія з іх будуць прысвечаны такім актуальным пытанням, як выхаванне моладзі, эстафета пакаленняў, працоўны геройзм. Да 50-годдзя Вялікага Кастрычніка і 50-годдзя рэспублікі кінадакументалісты рыхтуюць галерэю партрэтаў сучаснікаў, людзей, якія ўзвялічваюць славу роднага краю. Але час вымушае па-новаму асэнсаваць і «старыя», ужо закранутыя тэмы. Так, М. Тараткевіч зазначыў, што да гэтага часу не знайшла ў нашай дакументальнай кінематаграфіі вартага адлюстравання тэма партызанскай вайны на Беларусі, подзвіг, які здзейсніў беларускі народ у барацьбе з фашызмам. Р. Ясінскі прапанаваў стварыць стужкі, «зыходным момантам» якіх будуць эпізоды, знятыя аператарамі кінахронікі дзесяць, дваццаць, трыццаць гадоў назад.

На пленуме адзначалася, што студыя хранікальна-дакументальных фільмаў мала выпусціла стужак, прысвечаных працаўнікам вёскі. Перад кінадакументалістамі паўсталі новыя вялікія задачы ў сувязі з рашэннямі майскага Пленума ЦК КПСС. Студыя пачала здымкі фільма, прысвечанага праблемам меліярацыі, але гэта толькі пачатак сур'ёзнай работы.

У кінадакументалістаў, як і на студыі мастацкіх фільмаў, рашаючае значэнне мае тэматычнае планаванне, сцэнарны «баявы прыпас». Г. Ратнікаў выказаў трывогу адносна якасці некаторых сцэнарыяў, прынятых дакументальнай студыяй. Аўтары іх не ўзнімаюць сур'ёзных праблем, падмяняюць сапраўдную публіцыстычнасць і страснасць ілюстрацыйнасцю і апісальніцтвам.

У барацьбе за высокую якасць твораў кінамастацтва значна большую ролю можа і павінен адыграць Саюз кінематаграфістаў. На жаль, праўленне саюза не знайшло эфектыўных форм умацавання сувязей паміж студыямі, наладжвання шчырага абмену думак, творчай вучобы. Мерапрыемствы, якія арганізоўвае саюз, часцей за ўсё зводзяцца да прагляду фільмаў і слухання лекцый. Патрэбны і такія формы вучобы. Але галоўнае ў тым, каб стварыць у саюзе, на абмеркаваннях абстаноўку сапраўднай творчай заклапочанасці, прынцыповасці, заахвочвання пошукаў.

М. Тараткевіч выказаў прэтэнзіі да праўлення за тое, што яно мала цікавілася жыццём дакументалістаў. Летась студыя выпусціла звыш дваццаці фільмаў, аднак ніводзін з іх так і не быў абмеркаваны.

Прамы абавязак саюза — клапаціцца, каб работнікі кіно не адрываліся ад грамадскага жыцця рэспублікі, мацавалі сувязі з іншымі творчымі саюзамі. Недаравальна, калі саюз стаіць убаку ад важных грамадскіх і культурных падзей. А іменна так атрымалася з удзелам мастакоў кіно ў мастацкай выстаўцы, прысвечанай 50-годдзю Савецкай улады: кінематаграфісты на яе не былі запрошаны.

На студыях востра стаіць пытанне аб выхаванні і замацаванні кадраў. Студыя навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў, напрыклад, адчувае патрэбу ў сцэнарыстах. Магчыма, праўленню варта склікаць семінар кінанарысістаў, як прапанаваў Г. Ратнікаў. Трэба таксама падумаць, ці не накіраваць на сцэнарны факультэт Усесаюзнага інстытута кінематаграфіі найбольш здольных студэнтаў-журналістаў. В. Нячай з трывогай гаварыла, што ў кіно дрэнна выкарыстоўваюцца артыстычныя кадры рэспублікі. Ул. Белавусаў прывёў факты, якія сведчаць, што на «Беларусьфільме» творчыя работнікі падоўгу знаходзяцца ў так званым прастоі, некаторыя з іх у сувязі з гэтым вымушаны пакідаць студыю.

Важнае пытанне аб прапагандзе кіно ўзняла кінакрытык Е. Бондарава. Мастацтвазнаўцы Украіны і Літвы дамагліся, каб рэкламныя выданні ў гэтых рэспубліках, тыпу нашага «На экранах Беларусі», былі ператвораны ў часопісы. Такой трыбуны кінакрытыкі ў нас пакуль не маюць. Тым шырэй павінны быць выкарыстаны для прапаганды кіно газеты, тэлебачанне, радыё. На Беларускім тэлебачанні, па прыкладу Масквы, варта, відаць, завесці сваю «Кінапанараму» з рэгулярнымі гутаркамі мастацтвазнаўцаў, прысвечанымі беларускім фільмам і дзеячам кіно. Саюзу кінаработнікаў трэба шырэй выкарыстаць магчымасці, якія з'явіліся ў сувязі з адкрыццём у Мінску Дома мастацтваў. Можна спадзявацца, што цяпер тут будуць наладжвацца не толькі прагляды кінафільмаў, але і гарачыя творчыя дыскусіі. У Мінску ёсць ужо і кінатэатр «Навіны дня». Працуе ён, аднак, пакуль што дрэнна. А гэты кінатэатр можна было б зрабіць сапраўднай трыбунай для кінадакументалістаў, наладжваць тут рэгулярныя сустрэчы з гледачамі, вывучэнне грамадскай думкі.

Гаворачы пра тое, што пытанні кіно павінны шырэй асвятляцца на старонках друку, Е. Бондарава і В. Нячай зрабілі асобныя крытычныя заўвагі ў адрас газеты «Літаратура і мастацтва».

Рад прамоўцаў закранаў праблемы развіцця тэлебачання. Малодшая сястра кіно — тэлемуза пакуль што робіць няпэўныя крокі. На тэлестудыі часта дубліруюць ужо вядомыя хранікальна-дакументальныя стужкі, і дублі гэтыя, як правіла, значна горшыя за свае фільмы-двайнікі. У той жа час дрэнна выкарыстоўваецца на тэлебачанні фонд хранікальна-дакументальных фільмаў. У сур'ёзнай дапамозе мае патрэбу нядаўна створаная студыя «Тэлефільм».

Усе выступленні на пленуме былі прасякнуты клопатамі аб тым, каб зрабіць беларускае кінамастацтва па-сапраўднаму яркім і баявым, уславіць у творах кіно веліч і прыгажосць нашай эпохі.

У прынятай рэзалюцыі работнікі кінамастацтва Беларусі аднадушна ўхваляюць рашэнні XXIII з'езда КПСС і заяўляюць, што актыўна будуць змагацца за выкананне задач, пастаўленых партыяй перад дзеячамі савецкай культуры.

ІМЯ ПІСЬМЕННІКА—ПІЯНЕРСКАЙ ДРУЖЫНЕ

У 1920 годзе ў вёсцы Хацюхова былога Халопеніцкага, цяпер Крупскага раёна, прыехаў настаўнік, будучы пісьменнік Міхась Клімковіч. Тут малады намуніст працаваў больш двух год.

Яшчэ і сёння старажылы вёскі добрым словам успамінаюць гэтага чалавека, які быў у іх родных мясцінах першым арганізатарам камсамольскай і партыйнай ячэек.

Па ініцыятыве мясцовых настаўнікаў і вучняў у Хацюхоўскай сярэдняй школе адкрыўся літаратурны музей. У ім сабраны шматлікія дакументы, успаміны, фотаздымкі, якія расказваюць пра жыццё, грамадскую і творчую дзейнасць аўтара тэксту Дзяржаўнага гімна Беларускай ССР. У асобнай экспазіцыі—кнігі і рукапісы пісьменніка.

Нядаўна ў клубе мясцовага калгаса адбыўся літаратурны вечар, прысвечаны Міхасю Клімковічу. Даклад аб жыцці, грамадскай і творчай дзейнасці пісьменніка зрабіла настаўніца Ніна Шмаўганец. Затым удава Міхася Клімковіча—Марыя Іосіфаўна, літаратуразнаўца Сцяпан Майхровіч, празаік Алена Васілевіч, паэт Браніслаў Спрынчан, настаўнік і літаратар Яўген Замерфельд выступілі з успамінамі. Пра свайго настаўніка, камуніста і арганізатара культурна-асветнай работы ў Хацюхове і навакольных вёсках расказвалі калгаснікі.

Вечар закончыўся мастацкай часткай. Школьны хор праспяваў песні на словы Міхася Клімковіча. Самадзейныя артысты чыталі яго вершы, паказалі Саветам!». п'есы «Уся ўлада Саветам!».

Літаратурны музей школы папоўніўся новымі кнігамі, рукапісамі, фотаздымкамі, якія падарылі госці вечара.

Па рашэнню Крупскага райкома камсамола піянерскай дружыне Хацюхоўскай школы прысвоена імя Міхася Клімковіча.

В. ПЯТРОЎСКІ.

МУЗЕЙНАЯ ВЫСТАЎКА

Са двара Гомельскага абласнога краязнаўчага музея ў працяглы рэйс па раёнах вобласці выехаў аўтаклуб з перасоўнай выстаўкай «Подзвігі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне». На 12 стэндах—да ста фотаздымкаў і фотакопій дакументаў, якія адлюстроўваюць усенародную барацьбу з фашызмам.

Асаблівa змястоўныя раздзелы выстаўкі «Героі-гамяльчане» і «Пад адным сцягам», дзе шырока паказаны партызанскі рух на тэрыторыі Гомельскай вобласці. Тут адлюстраваны ўдзел у баях з гітлераўцамі на беларускай зямлі і антыфашыстаў-інтэрнацыяналістаў: капітана чэхаславацкай арміі Яна Налепкі, ветурача 102-га славацкага палка Ладзіслава Дынды, славака Карала Тамашчыка, дачкі балгарскага народа таленавітай журналістцы Ліллі Кара-Стаянавай і іншых.

З паказам кампазіцый выстаўні наведвальнікам дэманструюцца кінафільмы «Змаганне за Гомель» і «Вызваленне Беларусі». Цяпер выстаўка абслугоўвае калгасы і саўгасы Веткаўскага раёна.

М. ГАТОЎКІН,
супрацоўнік Гомельскага абласнога краязнаўчага музея.

БЛІЗКА КОНКУРСНЫЯ ВЯРШЫНІ

Нібы хвалі, набягаюць і адыходзяць тур за турам музычныя спаборніцтвы конкурсу імя Чайкоўскага па розных спецыяльнасцях. І калі скрыпачоў і віяланчалістаў хутка напаткае радасць перамог або горыч паражэння (забягаючы наперад, чаго нельга рабіць да рашэння журы, можна сказаць, што тут ужо выяўляюцца праблемы канкрэтнай яснасці), дык піяністы і спевакі толькі пачалі свае шэсце па першым кругу.

Маладым канкурсантам цяпер аддадзены дзве лепшыя канцэртныя залы сталіцы — Вялікая зала кансерваторыі і філарманічная імя Чайкоўскага.

Права на адкрыццё конкурсу піяністаў далося аднаму з самых юных яго ўдзельнікаў, прадстаўніку краіны, якая ўпершыню ўключылася ў маскоўскае музычнае спаборніцтва, — 18-гадоваму ліванцу Валіду Рамжа Хаурані. Музычнасць юнака радкая, у пяць год ад нараджэння ён стварыў сваю першую п'есу, за якой пайшлі другія. Ён вучыўся музыцы ў ЗША, Аўстрыі, Італіі, цяпер паспяхова скончыў Цэнтральную музычную школу Маскоўскай кансерваторыі па класу педагога Алега Іванова. У мінулым вучня Эміля Гілельса і Льва Аборына. Валід марыць стаць студэнтам Маскоўскай кансерваторыі.

Потым да рояля падыходзіць амерыканец Эбат Пі Раскін 21 года, вучань славутай Разіны Бевінай, пераможца незлічоных нацыянальных конкурсаў; наступныя — Юджын Прыдонаў (ЗША), Пілар Лейва (Калумбія), зноў амерыканец, француз, венгрэц...

За дзень — два прослухоўванні. І з самай раніцы зала набіта біткам, а за дзвярыма яе — людзі, поўныя спадзяванняў і трывожных пытанняў, ад якіх нікуды не дзенешся, — «Ці няма лішняга білеціка». На любы нюанс рэагуе слухач, на любую праяву свайго, непаўторнага... Тут і веданне, і строгі, вытанчаны густ, а галоўнае — павага да нялёгкай працы музыканта.

У жыцці конкурсу «прыпынкаў няма» —яно імклівае, напружанае і выбуховае. Кожную гадзіну, кожную мінуту ў ім скрыжоўваюцца сотні самых палярных пачуццяў, эмоцый і думак — задавальнення і падзякі, ціпла і дабраты, спадзявання і радасці і, на жаль, засмучэнняў. Конкурс ёсць конкурс.

Ірына МАКАРЭВІЧ,
карэспандэнт АДН.

Па сотні і больш кніжак за тыдзень прадае Святлана Навумейка ў механічным цэху Гомельскага станкабудаўнічага завода імя С. М. Кірава. Тут дзяўчына працуе свідравальшчыцай. Яна ўдарнік камуністычнай працы. А прафесія кіяскёра ў Святланы грамадская.

Фота В. СТАРЧАНКАВА.

19 ЧЭРВЕНЯ—ДЗЕНЬ МЕДЫЦЫНСКІХ РАБОТНІКАЎ

ГАЮЧЫЯ РУКІ

С. С. Навумовіч — вынаходнік арыгінальнага прыстасавання для аперацый.

Міша Ф. упершыню ў жыцці пайшоў сам. Не, хлопчыку не адзін і нават не паўтара года, калі, звычайна, дзеці становяцца на ногі. Міша—падлетак. Але хадзіць ён да гэтага часу не мог: перахварэў у раннім маленстве на паліямізліт.

І вось бацькі хлопчыка даведаліся, што ў Мінску ёсць установа, дзе лечаць такія захворванні — Навукова-даследчы інстытут траўматалогіі і артапедыі. Сюды і прывезлі яны сына. Прывезлі з надзеяй і ў той жа час з затоенай трывогай у сэрцы — вельмі ж бездапаможнае было дзіця...

І Міша стаў на ногі... Пасля доўгага лячэння, пасля складанай аперацыі. Не будзем паглыбляцца ў метады гэтага лячэння. Раскажам лепш пра людзей, што ставяць на ногі многіх такіх, як Міша, хто вяртае радасць бацькам і ўсмешку дзецям.

Пазнаёмімся з Сямёнам Сцяпанавічам Навумовічам — кіраўніком дзіцячага артапедычнага аддзялення. Гэта ён якраз і рабіў аперацыю Мішу. Хударлявы твар, з-пад белай шапачкі на скронях прабіваецца сівізна. Пра сябе Сямён Сцяпанавіч расказвае сціпла. Скончыў Мінскі медыцынскі інстытут... Абараніў кандыдацкую дысертацыю... Закончыў работу над доктарскай...

Магчыма, і засталася б для нас невядомай адна цікавая дэталь з біяграфіі Навумовіча, калі б дырэктар Навукова-даследчага інстытута прафесар Роза Міхайлаўна Мініна не падказала:

— А Сямён Сцяпанавіч да таго ж у нас і вынаходнік. Сапраўды, С. Навумовіч скансструяваў арыгінальнае, вельмі зручнае для аперацый прыстасаванне. Яго ён называе так — апарат-націравальнік спіцы для аперацыйнага лячэння медыцынскіх пераломаў шыйкі бядра (з ім вы і бачыце С. Навумовіча на першым здымку). Эфектыўнасць гэтага прыстасавання даўно праверана на практыцы.

Аказваецца, цяга да вынаходніцтва, да тэхнікі ў Сямёна Сцяпанавіча з даўніх гадоў. Да паступлення ў медыцынскі інстытут ён працаваў слесарам (шостага разраду!) у дэпо імя Канстанціна Заслонава ў Оршы. Рукі яго раней «лячылі» паравозы, а зараз лечаць самае з самых складаных на зямлі — чалавека...

...Інжынер Мінскага трактарнага завода Пётр Сямёнавіч Яжоў у адзін з выходных дзён выехаў з сям'ёй адпачыць. І трэба ж было здарыцца, што, прагульваючыся, ён зачапіўся нагой за карэнне, упаў. І на табе — пералом у каленным суставе. Такі дыягназ устанавілі ў Інстытуце траўматалогіі і артапедыі. Аперацыю Яжову зрабіў кіраўнік клінічнага аддзялення для дарослых хворых кандыдат медыцынскіх навук Іосіф Робертавіч Варановіч. Зрабіў з дапамогай скансструяванага ім жа самім прыстасавання, вельмі простага і ў той жа час вельмі зручнага. Не будзем апісваць прынцып яго дзеяння, каб не перагружаць чытача спецыфізмамі. Скажам адно, што гэты апарат ухвалены, яго Варановіч з поспехам дэманстраваў на І Усесаюзным з'ездзе траўматолагаў і артапедаў у Маскве.

Вось ізноў зайшоў Іосіф Робертавіч у палату да свайго пацыента з традыцыйным запытаннем.

— Ну, як сябе адчуваеце?

— Дзякую, добра, — чуецца ў адказ.

Дзякую, добра... Як прыемна доктару чуць гэтыя словы! Сотні, дзесяткі сотняў раз чула іх і дырэктар інстытута Р. М. Мініна. Інстытут траўматалогіі і артапедыі яна ўзначальвае 16 гадоў. Памятае час, калі тут не было ніводнага медыка з вучонай ступенню. А цяпер у інстытуце — 18 кандыдатаў медыцынскіх навук, трое падрыхтавалі доктарскія. Шмат і здольнай моладзі. З маладымі навуковымі супрацоўнікамі Анатолем Бранаўцом, Віктарам Дзвіндзенкам, Алегам Казарыным, медыцынскімі сёстрамі Капіталінай Юдзінай і Людмілай Журкоўвай і прыйшла Роза Міхайлаўна ў дзіцячую палату прыроджаных вывіхаў, калі мы знаходзіліся ў Інстытуце. Удумліва схіліліся ўрачы над маленькай дзяўчынкай. Што яе чакала б у будучым, калі б яна не трапіла ў гэтую палату? Прыроджаная кульгавасць, ад якой што пазней, то цяжэй пазбавіцца.

Маленькія хворыя з цікаўнасцю пазіраюць на людзей у белых халатах. Яны яшчэ не разумеюць, колькі сілы, колькі ўмельства аддаюць ім урачы, каб вярнуць ім дужасць, прыгажосць.

Тым больш мала чаго разумеюць дзеці, калі трапляюць у фізіялагічную лабараторыю, якой кіруе Яўгенія Васільеўна Мальцава. Складаная апаратура, якой яна кіруе, запісвае біятокі мышцаў спіны і мозгу маленькага пацыента. Запіс плёнцы потым пакажа не. Раней гэта можна было выявіць толькі з дапамогай рэнтгеназдымкаў, што звязана з пагрозай абпраменьвання. Устаноўка ж, за якой вы бачыце Яўгенію Васільеўну, зусім бясшкодная для здароўя дзяцей. Да таго ж гэта вельмі пільнае «вока». Дзякуючы электронна-фізіялагічнаму абследаванню, лёгка выявіць пачатковыя фазы скрыўлення пазваночніка, загадзя пачаць лячэнне.

— Ну, як сябе адчуваеце?—пытаецца І. Р. Варановіч.

Пільнае «вока» ў Яўгеніі Васільеўны Мальцавай.

Яўгенія Васільеўна Мальцава таксама рыхтуецца да абароны доктарскай дысертацыі.

Скупымі раднамі рэпартажу мы расказалі толькі пра некалькіх вучоных інстытута. Тыя ж самыя цёплыя словы можна было б сказаць і пра кандыдатаў медыцынскіх навук Алену Сцяпанаўну Унчур, Аркадзя Сцяпанавіча Крука, і пра асістэнтаў Леаніда Янаўлевіча Грыгор'ева, Уладзіміра Паўлавіча Касцюка, пра многіх медыцынскіх спецсёр, санітарак. Усе яны шчыра радуюцца, калі хворыя на запытанне аб самаадчуванні вымаўляюць словы: «Дзякуй, добра».

С. БЛАТУН.
Фота Ул. КРУКА.

«Удумліва схіліліся ўрачы над маленькай дзяўчынкай...»

«Беларуская полька», «Лявоніха», «Пеўні», «Руская тройка», «Волжская кадрыля», фінскі жартоўны танец— вось няпоўны пералік танцаў, якія выконваюць удзельнікі танцавальнага гуртка мастацкай самадзейнасці Навагрудскага раённага Дома культуры. (Кіраўнік гуртка Аляксандр Крайнін). У самадзейным гуртку займаюцца звыш 30 рабочых, навучэнцаў і служачых раённага цэнтра.

На здымку — «Рускі танец».

Фота Ул. КРУКА.

СВЕТЛЫ І ШЧОДРЫ ТАЛЕНТ

МАСТАК З ГАРАЧЫМ СЭРЦАМ

Канстанцін Мікалаевіч Саннікаў. Сёлета яму было б семдзесят гадоў...

Каму з прыхільнікаў беларускага нацыянальнага тэатра не знаёма гэта імя? Аматары тэатра саракавых гадоў вымаўлялі яго звычайна ў дачыненні да хвалюючага спектакля «Канстанцін Заслонаў». Паэтычны спектакль пра подзвіг легендарнага партызана—аршанскага чыгуначніка—ішоў у тэатры амаль штодзённа. І наўрад ці знойдзецца хоць адзін мінчанін, які б не бачыў гэтую хвалюючую драму. Пастаўлены сэрцам і розумам мастака-патрыёта, спектакль гучаў як гераічная песня, якая ўслаўляе подзвіг народа-партызана. І, як песню, іграли яго акцёры—на адным усхваляваным дыханні. Як песня, працягвае ён гучаць у сэрцах гледачоў доўгія гады.

У чым жа сіла гэтага твора? Чаму цяпер, перачытваючы п'есу А. Маўзона, не адчуваеш тых эмоцый, якія хвалявалі пасля выхаду з тэатра тады? Зусім не таму, што ў шасцідзесятых гадах мы сталі халодныя і раўнадушныя. А толькі таму, што «Канстанцін Заслонаў» у пастаноўцы Саннікава быў яркім творам тэатральнага мастацтва, у якім высокая ідэя раскрывалася сродкамі высокага прафесіянальнага майстэрства. Кожны вечар у час паказу сцэна і глядзельная зала на гэтым спектаклі былі адно цэлае. «Канстанцін Заслонаў» у пастаноўцы К. Саннікава з Б. Платонавым, Г. Глебавым і Ул. Дзядзюшкам у галоўных ролях—адна з самых яркіх старонак беларускага тэатральнага мастацтва.

Пасля купалаўцаў «Канстанціна Заслонава» ставілі многія тэатры краіны. Да п'есы А. Маўзона звярнулася і кіно. Але ні адна з гэтых спроб не аказалася раўнацэннай той вялікай з'яве ў мастацтве, якой стала пастаноўка К. М. Саннікава.

Па ацэнцы газеты «Правда», «Канстанцін Заслонаў» з'яўляецца адным з лепшых спектакляў пра Вялікую Айчынную вайну ў рэпертуары савецкага тэатра». «З поўнай падставай мы можам назваць гэты спектакль сапраўды народным, патрыятычным, у якім партыйная ідэйнасць з'яўляецца асноўным, вядучым пачаткам. Гэты спектакль надзвычай дакладна дае нам уяўленне аб творчым абліччы і стылявых асаблівасцях Тэатра імя Янкі Купалы», — пісаў часопіс «Театр».

Стылявыя асаблівасці Тэатра імя Янкі Купалы з новай сілай выявіліся ў наступным спектаклі К. Саннікава—па п'есе К. Крапівы «Пяюць жаваранкі». І зноў—гэта перш за ўсё вострая сучаснасць, палымянасць пастаноўшчыка ў вырашэнні актуальнай тэмы. І зноў—яркасць, непаўторнасць каларыту камедыйных акцёрскіх сродкаў В. Пола, Ул. Дзядзюшкі і многіх іншых майстроў, з якімі ў Саннікава-рэжысёра заўсёды знаходзілася агульная творчая мова.

Як рэжысёр Канстанцін Мікалаевіч захапляў акцёраў, сваім вобразным бачаннем будучага спектакля, завостранасцю, смеласцю ў вырашэнні сцэнічных вобразаў, палымянасцю і пастаяннай творчай энергіяй. Дастаткова прыгадаць, як горача ён рэпеціраваў сатырычную камедыю А. Макаёнка «Выбачайце, калі ласка!», як хваляваўся ён на гэтых рэпетыцыях, як загараліся ў яго вочы, як ён да хрыпаты іншы раз спрачаўся і з аўтарам, і з акцёрамі, і з самім сабою. Дастаткова прыгадаць, як усхваляваны, расчырванелы, без піжака, ён імкліва ўрываўся з залы на сцэну і там штосьці тэмпераментна даказваў і паказваў выканаўцам,—і перад намі паўстане жывая карціна таго, як працаваў Саннікаў. У многім спрэчная і даволі вострая па тым часе п'еса А. Макаёнка захапіла рэжысёра цалкам. А захапіўшыся сам, Саннікаў здолеў захапіць астатніх. І зноў, як вынік,— спектакль, у якім бліснулі цудоўнымі акцёрскімі ўдачамі Л. Ржэцкая, Г. Глебаў, П. Малчанаў, Ул. Дзядзюшка...

Наогул гаварыць пра рэжысёра Саннікава ў адрыве ад акцёраў немагчыма. Думаецца, што рэжысёрскі талент Канстанціна Мікалаевіча так ярка і так шматгранна раскрываўся іменна праз акцёраў, і не толькі праз акцёраў-майстроў, але і зусім юных, нявопытных, якія рабілі свае першыя крокі на сцэне.

Я ўжо гаварыў пра вынікі творчай узаемасувязі К. Саннікава з вядучымі майстрамі беларускага тэатра. Дастаткова прывесці яшчэ і прыклады творчага ўздзеяння Канстанціна Мікалаевіча на станаўленне і рост такіх у той час маладых артыстаў, як В. Тарасаў, Л. Давідовіч, А. Рынковіч, Л. Драздова і многіх, многіх іншых.

Рэжысёрскі талент К. Саннікава раскрыўся і заблішчаў у пастаноўках п'ес савецкіх аўтараў, у барацьбе за ўсталяванне сучаснай тэмы на сцэне беларускага тэатра. «Рэйкі гудуць» Ул. Кіршона, «Авангард» В. Катаева, «Контратака» Д. Курдзіна, «Дыктатура» І. Мікітэнкі, «Мой друг» М. Пагодзіна, «Сержант Дроб» і «Пагібель воўка» Э. Самуйлёнка, «Маскоўскі характар» А. Сафронава, «Простая дзяўчына» К. Губарэвіча і, нарэшце, апошні спектакль—па п'есе П. Васілеўскага «Вера, Надзея, Любоў» —вось няпоўны пералік спектакляў на сучасныя тэмы, у якіх Саннікаву-рэжысёру ўдалося вырашыць даволі складаныя задачы. Дадайце сюды спектаклі аб гераічнай барацьбе савецкага народа супраць фашызму — такія, як «Хлопец з нашага горада» К. Сіманава, «З народам», «Людзі і д'яблы» К. Крапівы, «Цытадэль славы» К. Губарэвіча,—і творчае аблічча рэжысёра К. М. Сачнікава паўстане перад намі вельмі выразна. Гэта мастак сучасны, мастак палымянай душы, гарачага сэрца, які жыў і мысліў справамі і думкамі свайго народа.

Бадай, не назавеш ніводнай галіны беларускага нацыянальнага мастацтва, у якой бы К. М. Саннікаў не прымаў удзелу, не знойдзеш мастацкі калектыў, у лёсе якога не засталося б часцінкі творчага гарэння яго шчодрага таленту. У Другім беларускім тэатры—Тэатры імя Якуба Коласа—Канстанцін Мікалаевіч паспяхова пачаў сваё прафесіянальнае акцёрскае і рэжысёрскае жыццё пасля сканчэння тэатральнага інстытута (1926 г.). Яркія сучасныя спектаклі К. М. Саннікава, пастаўленыя ім на сцэне Трэцяга беларускага тэатра, вывудзяць гэты своеасаблівы творчы калектыў у лік буйных прафесіянальных тэатраў у трыццатыя гады.

Саннікаў-рэжысёр сустракаецца ў творчай рабоце з калектывамі даваеннага ТЮГа, Гродзенскага і Бабруйскага драматычных тэатраў. Ён кансультуе народныя тэатры і шматлікія самадзейныя калектывы рэспублікі... Здымаецца і ставіць у кіно. Займаецца выхаваўчай работай у розных студыях пры тэатрах, на рэспубліканскіх курсах кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці, на акцёрскім і рэжысёрскім факультэтах Тэатральна-мастацкага інстытута... Я ўжо казаў пра асноўную яго дзейнасць у Тэатры імя Янкі Купалы, якому ён аддаў амаль трыццаць гадоў свайго яркага, багатага творчымі ўзлётамі жыцця. Тут Саннікаў сфарміраваўся як мастак, тут ён паставіў свае лепшыя спектаклі «Канстанцін Заслонаў» і «Пяюць жаваранкі», удастоеныя Дзяржаўных прэмій.

Саннікаў-мастак быў нястомны. Ён аддаваўся творчасці цалкам. Мала сказаць, што гэта быў чалавек-працаўнік у мастацтве. Гэта была сама энергія, само жыццё, якое ён успрымаў надзвычай шырока і радасна. Усё, што ні рабіў Саннікаў у тэатры, ён рабіў з гарачым сэрцам.

Вялікае творчае жыццё Канстанціна Мікалаевіча Саннікава—мастака самабытнага і яркага—гэта самастойны вялікі раздзел у гісторыі сучаснага беларускага тэатра. Раздзел гэты яшчэ не даследаваны і не напісаны. Ён чакае свайго прачытання.

А. БУТАКОЎ.

К. М. САННІКАЎ.

АДЗІН З ПЛЕЯДЫ

Цяжка ўявіць наша мастацтва без імя Канстанціна Мікалаевіча Саннікава — аднаго з піянераў, будаўнікоў і стваральнікаў беларускага савецкага драматычнага тэатра.

Мы абавязкова называем імя К. М. Саннікава, прыгадваючы першыя самадзейныя гуртні, аматарскія і прафесіянальныя трупы. Ён прайшоў па ўсіх ступенях мастацтва, ажыццяўляючы сваю мару—служыць мастацтвам свайму народу.

К. Саннікаву давялося працаваць і вучыцца ў такіх майстроў сцэны, як Е. Міровіч, К. Смышляеў, С. Эйзенштэйн, Б. Бернет, І. Пыр'еў, А. Дзікі, Л. Свердлін. Ён быў з той плеяды, што і Л. Ржэцкая, Г. Грыгоніс, Ул. Дзядзюшка, Г. Глебаў, І. Жданоўч, Ул. Уладамірскі, Б. Платонаў, Ул. Крыловіч, В. Пола, В. Галіна, С. Бірыла, С. Станюта, Л. Рахленка, Л. Шынко.

Якое сузор'е, якія выдатныя сябры і паплечнікі!

Канстанцін Мікалаевіч як ацёр і рэжысёр рос разам з нашым тэатрам, які развіваўся на лепшых народных традыцыях і абвясціў сваім прынцыпам вернасць жыццёвай праўдзе, служэнне народу. Гэты прынцып чырвонай нітнаю прайшоў праз усю шматгадовую дзейнасць К. Саннікава як рэжысёра-пастаноўшчыка.

А колькі сіл, таленту, ведаў аддаў Канстанцін Мікалаевіч стварэнню беларускага савецкага рэпертуару! Ён не схіліцца перад яго самаадданай работай з нашымі драматургамі!

Вялізны творчы вопыт работы ў тэатры Канстанцін Мікалаевіч перадаваў моладзі. Каля двух дзесяткаў год выкладаў ён у Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце майстэрства акцёра і рэжысуру.

А хіба праходзілі хоць калі-небудзь агляды мастацкай самадзейнасці без удзелу К. М. Саннікава? Я такога не памятаю!

У дні Вялікай Ачыннай вайны Саннікаў — абавязковы ўдзельнік франтавых артыстычных брыгад.

Я не магу не сказаць і пра Саннікава як пра чалавека. Галоўнае—у яго былі заўсёды добры настрой, уважлівасць, гатоўнасць памагчы, уменне ўлавіць новую думку, падтрымаць яе. З ім усюды было добра, з яго мяккай, сардэчнай усмешкай.

Канстанцін Мікалаевіч Саннікаў урос у наша беларускае савецкае мастацтва. Ён здолеў шмат узяць ад народа і аддаў яму ўсё.

Л. АЛЕКСАНДРОЎСКАЯ,
народная артыстка СССР.

Спектаклі нашых гасцей

ХАРАКТАР І ХАРАКТАРНАСЦЬ

«АРФЕЙ СПУСКАЕЦЦА Ў ПЕКЛА» Ў РАСТОЎСКІМ ТЭАТРЫ

Драма Тэнесі Уільямса «Арфей спускаецца ў пекла» — змястоўная, багатая і тэкстам, і падтэкстам, Востры сюжэт, багацце падзей і самых разнастайных характараў, якія нараджае сённяшняя амерыканская рэчаіснасць,—праз усё гэта пераканальна і досыць рашуча выкрываецца антычалавечая сутнасць таго сацыяльнага ладу, пры якім усё прадаецца і ўсё купляецца. Больш таго: аўтар драмы спрабуе знайсці «пункты апоры» для барацьбы супраць гэтага ладу. Ён бачыць іх і ў часта неўсвядомленым пратэсце людзей «купленых», і ў чысціні душы такіх, як вандроўны спявак Вэл Ксаўе, якога купіць нікому не ўдаецца, і нават у рэшітках незамутненых здаровых інстынктаў жыхароў некалі дзікага краю, разбэшчанага амерыканскай цывілізацыяй.

Рак расізму, які раз'ядае сённяшнюю Амерыку, як праз павелічальнае шкло, выразна відаць у трагічнай гісторыі Лэдзі Торанс. У гэтай гісторыі для аўтара драмы дарагія непахіснасць, непрадажнасць жывой чалавечай душы, момант нараджэння ў гэтай душы рашучага пратэсту супраць несправядлівасці.

У Растоўскім тэатры пастаноўку гэтага спектакля, паказанага мінчанам, ажыццявіў народны артыст РСФСР Э. Бейбутаў. Можна смела сказаць, што гэта ўдача тэатра. Удача не выпадковая. Нездарма ж «Арфей спускаецца ў пекла» ідзе ў тэатры ўжо шосты год. Пастаноўшчыку спектакля і асноўным выканаўцам удалося неназойліва, але выразна давесці думку аб тым, што, як бы ні імкнуўся канаючы лад цягнуць у нябыт за сабой усё здаровае, — яму гэта не ўдасца.

...Звычайны амерыканскі гарадок. Такі, як і многія-многія іншыя. З той хіба розніцай, што пры ўездзе ў яго красуецца плакат з грозным папярэджаннем, каб негры не затрымліваліся тут надоўга. І яны, па ўсім відаць, не затрымліваюцца. І вось мясцовая «інтэлігенцыя»—уладальнік магазіна, шэрыф, плантатары і іх жонкі — засумавалі, што надта ж ужо «роўна» ідзе жыццё ў гарадку. Яны рады кожнай плётцы, пільна прыглядаюцца да кожнага новага чалавека, што з'яўляецца тут,— ці нельга да яго прычапіцца, незалежна ад таго, негр ён ці белы.

Расісты, згуртаваныя, нахабныя, здаецца, здолелі ўжо задушыць усё жывое, што было ў гарадку. Быў, напрыклад, некалі тут гандляр віном, выхадзец з Італіі, які асмеліўся абслугоўваць у сваёй краме неграў. Дык жа з ім даўно-даўно расправіліся — спалілі зажыва. Дачка гэтага італьянца Лэдзі і па сёння не падазрае, што галоўны забойца яе бацькі—багаты ўладальнік магазіна Джэйб Торанс, за якога яна ў адчаі пасля смерці бацькі выйшла замуж. Яна магла б выйсці за Дэвіда Катрыра, але ён аддаў перавагу багатай нявесце. Цяпер Дэвід—багаты плантатар. Лэдзі замкнулася ў сабе. Яе муж смяртэльна хворы, але па-ранейшаму натхняе дзейнасць «тайнага легіёна», які сакрушае ўсё жывое, што толькі з'яўляецца ў гарадку.

Жыве яшчэ тут Кэрал Катрыр. Некалі яна нават пісьмовыя пратэсты насіла губернатару штата — пехатой, прыкрыўшы цела адной толькі мешкаванай. Цяпер жа і яе «нейтралізавалі» — разбэсцілі багаццем і аб'явілі вар'яткай.

І яшчэ ёсць адна душа ў гарадку, якая інстынктыўна імкнецца ўратавацца ад акаляючай жорсткасці сваім па-наіўнаму модным мастацтвам. Гэта Ві Толбат — жонка шэрыфа.

Тое, што далёка «не ўсё спакойна» ў гэтым «Дацкім каралеўстве», пасведчыла з'яўленне ў гарадку больш-менш звычайнага сумленнага чалавека — спевака Вэла Ксаўе...

Варта было з'явіцца яму, як адразу (і адкуль толькі яно ўзялося!) да яго пацягнулася ўсё, што ўцалела ў гэтым пекле, куды трапіў гэты «сучасны Арфей». Але адначасова пацягнулася і ўсё агіднае, мабілізавалася ўсё жорсткае, усё цёмнае — супраць промня, які трапіў у гэты змрок.

Джэйб Торанс (яго праўдзіва і каларытна іграе Г. Гуроўскі) пераканаўся, што, купіўшы цела Лэдзі, ён не купіў яе душу. Бяссільная злость Торанса забівае Лэдзі.

На жыццёвым шляху Лэдзі (заслужаная артыстка РСФСР А. Кржачкоўская) сустрэўся Вэл Ксаўе (заслужаны артыст РСФСР і ТАССР М. Праваторaў) — чалавек, які здолеў застацца па-за межамі тае «купліпродажу», у якой апынуліся і Лэдзі, і Ві Толбат, і многія, многія іншыя. Пацягнуўшыся ўсёй душой да Вэла, Лэдзі імкнецца калі не вырвацца з логава Торанса, то, прынамсі, захаваць жывой сваю душу, некалі пакалечаную Дэвідам Катрырам. А. Кржачкоўская, выдатна валодаючы акцёрскай тэхнікай, стварае прывабны вобраз тэмпераментнай італьянкі, характар, багаты адценнямі ўсіх чалавечых пачуццяў — ад інтымнейшай пяшчотнасці да тэмпераментнейшага гневу. Шкада толькі, што іншы раз тэхніка ў выканаўцы выходзіць на першы план.

М. Праваторaў пераканальна паказвае, як ягоны герой імкнецца выстаяць у няроўнай барацьбе. Вэл Ксаўе, які больш за ўсё на свеце цэніць сваю свабоду, увасабленнем якой з'яўляецца яго «спадарожніца жыцця» — гітара, не можа не прыцягваць да сябе ўсё лепшае ў душах людзей. Вось М. Праваторaў — Вэл расказвае тут жа выдуманую ім самім казку пра дзівосную птушку, якая вымушана ўвесь час лётаць у небе, бо не мае яна ног, каб апусціцца на зямлю,—і мы бачым перад сабой чалавека высокай мары. Вось ён радуецца, што ў Лэдзі будзе ад яго дзіця, — і мы бачым самага шчаслівага на зямлі чалавека, быццам над ім і не навісла смяртэльная небяспека... Усе адценні перажыванняў свайго героя М. Праваторaў перадае пераканальна, ускрываючы ўсе падтэксты ролі.

Не менш цікава абмалявана ў спектаклі Кэрал Катрыр. Артыстка А. Філіпава тактоўна раскрывае вострыя супярэчнасці ў характары сваёй гераіні, яе замяшанне, яе шчырае імкненне памагчы, калі над Вэлам навісла бяда, яе нянавісць да таго свету, у якім даводзіцца жыць, — нянавісць інстынктыўную, якая паступова пераходзіць у свядомую. Артыстка праз увесь спектакль вядзе сваю гераіню да фіналу. У ім Кэрал і дзядзечка Плезант (Ю. Атараў) стаяць перад лінчавальнікамі, якія толькі што спалілі Вэла, і адказваюць ім усім гучным рогатам. І гэты рогат — сведчанне таго, што многае змянілася ў гарадку, у якім, здавалася б, доўгі час нічога не змянялася. Хоць Джэйб Торанс і забіў Лэдзі і Вэла — ён іх не перамог. Зерні пратэсту супраць расізму далі свае ўсходы. Умельства паказаць гэтае нараджэнне пратэсту не ілюстрацыйна якраз і прываблівае і ў рабоце пастаноўшчыка, і ў ігры выканаўцаў лепшых роляў у спектаклі — тых выканаўцаў, якія стварылі характары. Мабыць, таму і трымаецца спектакль у рэпертуары тэатра столькі год, што ў ім створаны пераканальныя характары Вэла, Лэдзі, Кэрал, Джэйба, Ві Толбат (К. Яроміна). На гэтых характарах трымаецца спектакль. Але побач з характарамі ў спектаклі жыве і проста характарнасць. Ад гэтага не-не ды і парушаецца ансамбль. Вось, напрыклад, Дэвід Катрыр (І. Багадух). Выканаўца гэтай ролі толькі абазначае пачуцці свайго героя, ад чаго гіне ў спектаклі прынцыпова важная сцэна размовы Лэдзі і Дэвіда, калі яна прызнаецца яму, што ў іх павінна было быць дзіця. Падменены характарнасцю чыста знешняй і вобразы шмат якіх іншых персанажаў другога плана, за выключэннем, бадай, сядзелкі Портар (П. Пятрова) ды дзядзечкі Плезанта.

Увогуле ж, завяршаючы гэтыя нататкі, хочацца сказаць, што Растоўскі тэатр глыбока прачытаў п'есу Тэнесі Уільямса, стварыў па ёй змястоўны спектакль.

Ул. БОЙКА.

ТАКІ ЁН У ПАМЯЦІ

Ёсць людзі, пра якіх успамінаеш праз усё жыццё. Такім чалавекам для мяне, ды, відаць, не толькі для мяне, быў Канстанцін Мікалаевіч Саннікаў, адзін са старэйшых дзеячоў беларускага савецкага тэатра.

Паўстагоддзя жыцця аддаў Канстанцін Мікалаевіч тэатру. Таго, што ён зрабіў для беларускага тэатральнага мастацтва, нельга пераацаніць.

Складаны і цяжкі быў творчы шлях Саннікава. У яго творчым жыцці былі ўзлёты і заняпады. Зведаў ён слодыч поспеху і горыч няўдач. Але ніякія нягоды не перашкодзілі яму, выхаванаму на рэалістычных традыцыях Шчэпкіна і Станіслаўскага, пранесці праз ўсё сваё творчае жыццё ідэю служэння народу сродкамі мастацтва.

Саннікаў быў глыбока нацыянальным мастаком, умеў ярка і праўдзіва раскрываць нацыянальны характар, тварыць на аснове сацыялістычных прынцыпаў мастацтва. У сваіх спектаклях ён заўсёды і нязменна дамагаўся адзінства яркай нацыянальнай формы і глыбокага сацыялістычнага зместу. Яго ніколі не прываблівалі павевы, што ішлі да нас з Захаду. Ён быў верны традыцыям праслаўленай рускай школы. Галоўным у ягонай творчасці было грамадзянскае стаўленне да п'есы, да яе вобразаў, якія ён раскрываў, заўсёды абапіраючыся на жыццёвыя паралелі.

Рэжысёрскі талент Саннікава ярка выявіўся ў такіх спектаклях, як «Пагібель воўка», «Канстанцін Заслонаў», «Пяюць жаваранкі», «З народам», «Выбачайце, калі ласка!».

Спектакль «Канстанцін Заслонаў» у Акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы захапляў гледача сілаю патрыятычнага пачуцця, закладзенага ў ім. Ён быў поўны ўсхваляванай рамантыкі подзвігу савецкіх людзей. Поспех спектакля быў вялікім поспехам купалаўцаў і, у першую чаргу, вядома, Саннікава, якому ўдалося аб'яднаць вакол п'есы думкі, пачуцці і імкненні акцёраў.

Вялікі эмацыянальны зарад і творчы агонь неслі і многія іншыя спектаклі, пастаўленыя Саннікавым. У іх, як правіла, цэнтральнае месца адводзілася акцёру.

Саннікаў умеў абуджаць у акцёра яго творчую энергію, захапляць звышзадачай драматычнага твора. Талент рэжысёра-педагога, які з усёй адданасцю працаваў з акцёрамі, спалучаўся ў ім з талентам арганізатара. Росквіт Тэатра імя Янкі Купалы ў пасляваенны перыяд быў у многім звязаны з імем таленавітага рэжысёра. Саннікаў заўсёды горача адгукаўся на ўсе больш-менш значныя з'явы сучаснага яму жыцця. Для многіх ён быў прыклад мастака-патрыёта, мастака-грамадзяніна, які бязмежна любіў сваю Радзіму, свой народ.

Канстанцін Мікалаевіч быў акцёр усім сваім нутром, усім сваім жыццём. Нават з выгляду ён быў артыстычны. Заўсёды жвавы і, я сказаў бы, трошкі экзальтаваны, хоць стомлены, стары гадамі, ён нязменна быў у добрай творчай форме. На дзіва лёгкі ён быў на пад'ём. Скажы яму: «Канстанцін Мікалаевіч, трэба памагчы аршанцам выпусціць спектакль»,—і ён у той жа момант сядае ў машыну і едзе да самадзейных артыстаў. Працуе з імі, не заўважаючы часу, не адчуваючы стомы.

Так, шчодрым чалавекам быў Саннікаў. Добра пражыў ён сваё жыццё.

Пра творчую дружбу Саннікава з драматургамі гаварылася і пісалася ўжо нямала. Гэтая яго найкаштоўнейшая рыса варта пераймання. «Адкрыццём» многіх драматургаў тэатральнае мастацтва Беларусі абавязана рэжысёру Саннікаву.

Апошнія гады свайго жыцця Саннікаў цалкам прысвяціў педагагічнай дзейнасці. Талент педагога з кожным годам у ім мацнеў і развіваўся. Даволі сказаць, што яго вучнямі былі цяпер ужо досыць вядомыя акцёры Тарасаў, Талкачова, Давідовіч, Зубкова, Аўсяннікаў. Яны ўсе цяпер працуюць у Тэатры імя Я. Купалы. Іх творчыя поспехі даюць магчымасць высока ацаніць Саннікава як выхавальніка акцёрскай змены.

Жыццё, пражытае Саннікавым у мастацтве, выклікае пачуццё глыбокай павагі і пашаны да яго. У дні, калі адзначаецца сямідзесяцігоддзе Канстанціна Мікалаевіча, з любоўю і ўдзячнасцю ўспамінаючы пра дні нашай сумеснай работы, я не магу не выказаць здзіўлення, што да гэтага часу няма яшчэ манаграфіі, прысвечанай гэтаму самабытнаму, таленавітаму дзеячу беларускага тэатральнага мастацтва.

Д. АРЛОЎ,
народны артыст БССР.

ПАДЗЯКА ЗА ДАСЛАНЫЯ КНІГІ

З вялікай цікавасцю пазнаёміліся актывісты гарадскога камітэта Саюза чэхаславацка-савецкай дружбы ў г. Брно з кнігай М. Садковіча і Я. Львова «Георгій Скарына» і даследаваннем С. Майхровіча «Жыццё і творчасць Ф. Багушэвіча». Старшыня гарадскога рускага клуба, заслужаны настаўнік ЧССР Кірыл Немешкал у сваім пісьме дзякуе беларускім сябрам за дасланыя кнігі і паведамляе аб намеры апублікаваць на гэтыя творы анатацыі, а таксама надрукаваць асобныя раздзелы з іх.

Нашых чэшскіх сяброў зацікавіла таксама кніга кандыдата гістарычных навук, выкладчыка БДУ імя Ул. І. Леніна Н. Гусакоў «Барацьба плебейскай апазіцыі супраць феадальна-каталіцкай рэакцыі ў першы перыяд гусіцкага руху».

САМАДЗЕЙНЫ ТЭАТР ЛЯЛЕК

Загадчыца Навікоўскага сельскага клуба Віцебскага раёна Софія Парчынская кіруе тэатрам лялек. Самадзейныя артысты за пяць год паставілі больш сотні спектакляў для дзяцей, калгаснікаў і рабочых раёна.

С. Парчынская добра малюе. Гэта дапамагае ёй ствараць удалыя дэкарацыі.

Пры сельскім клубе цяпер працуе шэсць гурткоў мастацкай самадзейнасці. У іх удзельнічае 76 чалавек.

А. УЗДЗЕНСКІ.

ПА ВЫСТАВАЧНЫХ ЗАЛАХ

ЗАЎТРА—У ЖЫЦЦЁ

Шкада, што пра гэтую выстаўку мала хто ведае. Дрэнна, што ў горадзе няма яркіх плакатаў, якія б паведамлялі: «У Беларускім дзяржаўным тэатральна мастацкім інстытуце адкрыта выстаўка студэнцкіх работ...» І добра было б, каб лепшыя яе экспанаты атрымалі пуцёўку ў жыццё...

Але пачнём па парадку. Неўзабаве Тэатральна-мастацкі інстытут упершыню выдасць дыпломы мастакам-прыкладнікам, тым, хто будзе ствараць тканіны і кераміку, афармляць інтэр'еры і прамысловыя вырабы, распісваць фрэскамі будынкі і праектаваць мэблю. Мастацтва выходзіць з музеяў і выставачных залаў, кроча ў вуліцы, у кінатэатры і кафэ, у магазіны і нашы дамы... І садзейнічаць гэтаму будуць і заўтрашнія выпускнікі нашага інстытута. А сёння ў спартыўнай зале інстытута сабраны работы пяцікурснікаў і іх малодшых сяброў.

Вось перад намі стэнд кафедры мастацкага афармлення тканін і мадэліравання вырабаў лёгкай прамысловасці. Ткацтва — нацыянальнае мастацтва беларусаў. У рэспубліцы шмат камбінатаў, якія выпускаюць дывановыя і жакардавыя тканіны. Але якраз жакардавыя тканіны, створаныя па эскізах студэнтаў, не вылучаюцца ні прыгажосцю, ні арыгінальнасцю ўзораў. Чаму?

— Наша вучэбная база—цэх жакардавага ткацтва тонкасуконнага камбіната,—расказвае загадчык кафедры Іван Кірылавіч Утарушын,—але цэх мае свой план, і частая змена ўзораў і арнаментаў нялёгкая і нежаданая справа для яго. Ды і карыстацца нашы навучэнцы павінны тымі фарбамі, тым матэрыялам, які ёсць у цэху, так што тут асабліва не разгонішся...

Аднак там, дзе фантазія студэнтаў не абмежавана, нараджаюцца цікавыя рэчы. Радуе спалучэннем каляровых плям эскіз ворсавага дывана Г. Гаркунова. Яркія пеўні на тканіне Л. Баразны. Тонка стылізаваныя бірузовыя дрэвы і рудаватыя ўзвіхраныя коні з паднятымі грывамі на парцьеры студэнткі Н. Пілюзінай. Самая ж цікавая па настрою, па прыгажосці колеру—работа студэнткі трэцяга курса В. Крывашэевай «Вясна». Гэта дэкаратыўная парцьера для кафэ «Вясна». На ёй—ярка-зялёныя птушкі. З дакладным адрасам выконваў сваю работу і студэнт трэцяга курса Ул. Ломаць. Ён прадставіў вытрыманы ў серабрыста-палевых і карычневых адценнях габелен «Беларусь».

Ці ўбачым мы гэтыя прыгожыя рэчы ў месцах, для якіх яны прызначаліся?.. Пачуўшы гэтае пытанне, Іван Кірылавіч няпэўна паціскае плячыма... Маўляў, невядома! А чаму? Хіба такія ўжо ўтульныя і добра афармленыя нашы кафэ? Але ці ведае, скажам, адміністрацыя «Вясны» пра выкананую для іх работу?..

Адносна сувязі з жыццём, з заказчыкам на кафедры прамысловага мастацтва, інтэр'ера і абсталявання справы лепшыя.

— Праект самакатаў,—расказвае загадчык кафедры дацэнт Валянцін Іванавіч Гусеў,—адзінае і апошняе, што мы рабілі проста так, у парадку навучальнага задання.

Паводле праекта студэнта Л. Пісхоцкага будуць выраблядца краслы для нашага Тэатра оперы і балета. Па эскізах студэнта другога курса І. Савіна афармляецца зала жывапісу ў новым будынку інстытута. Цікавы праект інтэр'ера для кафэ па вул. Талбухіна, выкананы студэнтам А. Шатэрнікам. Ён вытрыманы ў серабрыста-шэрых і размята-фіялетавых танах з яркім усплёскам вітражу на фоне чорнай сцяны. Хацелася б, каб аўтар праекта кафэ Ю. Шліт выкарыстаў эскізы А. Шатэрніка.

Студэнты думаюць пра тое, як лепш аформіць уезды ў горад, корпус радыё-прыёмніка, розныя рабочыя памяшканні—ад канструктарскага бюро да АТС. Яны ствараюць праекты інтэр'ераў для кафэ, танцавальных залаў і фае кінатэатраў. Студэнты не толькі малююць. Яны вучацца працаваць з матэрыяламі. Па вучэбнаму плану трэба было авалодаць тэхнікай зграфіта. Ніхто не ставіў перад імі задач па кампазіцыі. Але і карычнева-палевая «Жалейка» В. Палякова, і бела-чорная «Старая Рыга» Д. Мохава, і трохкаляровы — чорна-белы з блакітным—«Малады алень» А. Чарнышова—добрыя работы.

Студэнты шукаюць новыя прыёмы афармлення інтэр'ераў. Вось работа С. Салохіна—аздабляльная пліта чырвонага колеру з чорнымі пробліскамі ўкрапленага ў яе антрацыту. У якасці эксперыменту студэнты паспрабавалі прадрапаць узор па сухім алебастры. Атрымалася. Такім жа чынам выкананы работы А. Клязовіча «Чаўны», «Сонца за бярозамі». Студэнт Р. Клімін даў на выстаўку праект афармлення фае і буфета новага кінатэатра на вул. Талбухіна. У тэхніцы зграфіта ён зрабіў пліткі з арнаментам для аблiцоўкі адной сцяны. Аднак гэты праект не будзе ажыццёўлены, бо нядаўна кінатэатр вырашылі назваць «Партызан», і тэматычна работа студэнта не падыходзіць. Але хіба мала ў нас безгустоўна афармленых кінатэатраў, дзе ўсё тое, што робяць студэнты, можна было б выкарыстаць?

На жаль, не ўсе кафедры інстытута працуюць так цікава і многа, як кафедра прамысловага мастацтва, інтэр'ера і абсталявання. У кераміст'аў толькі нядаўна з'явілася лабараторыя. Студэнты толькі авалодваюць разнастайнымі формамі мадэліравання матэрыялаў і прыёмамі работы. Найбольш цікавыя працы першакурснікаў Ул. Угрыновіча «Ваза», В. Абухова «Ваза для бэзу», В. Данчук—дэкаратыўна-насценная ўстаўка «Коннікі». Шкада толькі, што ў гэтых работах не адчуваецца ні беларускага каларыту, ні самабытнасці. У «Конніках» відавочныя ўкраінскія матывы.

Не парадавалі на выстаўцы творы мастакоў—мадэльераў, жывапісцаў. Усё тое, што далі на выстаўку мадэльеры, здаецца, было ўжо ў венгерскіх і польскіх часопісах мод. Жывапіс здзіўляе цьмяным каларытам, несамастойнай кампазіцыяй. Мала і работ манументалістаў. А ствараюць жа яны цікавыя рэчы. Тое, што можна ўбачыць на сценах падвала, дзе працуюць студэнты (з памяшканнем у інстытуце яшчэ цяжка), значна лепшае за выставачныя экспанаты. Хочацца адзначыць толькі партрэт эбаксітнымі смоламі студэнткі пятага курса З. Літвінавай і эскіз кампазіцыі для кафэ «Вясёлка» Я. Карманава. Мне здаецца, што ў такім нецікавым выступленні манументалістаў на выстаўцы вінаваты выкладчыкі.

І ў гэтым сэнсе Павел Канстанцінавіч Любамудраў, які вядзе графікаў, дае добры прыклад. Вось работы пяцікурсніка В. Пастушкова—камплект «Аэрафлот». Тут і праспект з зубрамі, і каляндар, і канверт, і таварны знак. І ўсё зроблена прыгожа, з тонкім адчуваннем стылю. Студэнт Р. Дублярр узяўся за афармленне оперных клавіраў. Цікавыя па выкананню яго вокладкі і супервокладкі для «Аіды» і «Рыгалета». Добра зроблены тэатральныя плакаты Ю. Нікіфаравым. Ул. Круглоў ярка аформіў томік А. Вазнясенскага «Майстры». Удала знойдзены фармат кнігі, шрыфты. З вялікім густам і пачуццём стылю паэта зроблены ілюстрацыі. Тонка і прыгожа аформіў Г. Сакалоў кнігу А. Грына «Чырвоныя ветразі», якая павінна выйсці ў выдавецтве «Беларусь».

Выстаўка сведчыць, што сярод студэнтаў ёсць добрыя мастакі. І кіраўнікі інстытута павінны лепш прапагандаваць работы сваіх выхаванцаў. Не чакаць, што да іх прыйдуць прадстаўнікі вытворчасці, праектных арганізацый. Трэба хадзіць самім, паказваць, каб тое, што знойдзецца ў інстытуце, ужо заўтра пайшло ў жыццё.

Мая ГАРЭЦКАЯ.

Не аб адным хлебе...

КАЛГАСНАЯ ПЯЦІГОДКА КУЛЬТУРЫ І БЫТУ

КАНФЕРЭНЦЫЯ Ў КАЛГАСЕ «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ» КАМЯНЕЦКАГА РАЁНА

Бываць у такіх калгасах, як «Савецкая Беларусь» Камянецкага раёна, карэспандэнту прыемна і радасна. Перш за ўсё вабяць працавітыя людзі, якія любяць сваю зямлю. Гэта — лепшыя механізатары Мікалай Казакоў, Васіль Наймук, Сцяпан Сахарчук, Міхаіл Белавед, каваль Уладзімір Вішанька, даяркі Любоў Нічыпарук, Вера Сахарчук, Вера Грыцук — усіх не злічыць.

Даяркі надойваюць цяпер у сярэднім па пуду малака ад кожнай каровы. Гэта дало магчымасць калгасу ўжо 17 чэрвеня выканаць гадавы план продажу малака дзяржаве. А ўсяго за першы год пяцігодкі будзе прададзена дзяржаве 2 700 тон малака, гэта на 564 тоны больш у параўнанні з мінулым годам. Першае месца ў вобласці па адкорму свіней займае Іван Лук'янюк, добрых поспехаў дамагаюцца свінаркі Надзежда Капусцінская, Ніна Шыдлоўская, Надзежда Карпук. Цудоўны лён вырошчваюць калгаснікі восьмай брыгады, якую ўзначальвае Вольга Грыцук.

На палях калгаса працуюць 34 трактары, 10 камбайнаў, больш як 20 аўтамашын і шмат іншай тэхнікі. Высокі ўзровень механізацыі — рашаючая ўмова росту сельскагаспадарчай вытворчасці.

Сёлета калгас плануе атрымаць грашовага прыбытку адзін мільён дзвесце тысяч рублёў. Паляводы дадуць у калгасную касу 250 тысяч рублёў, жывёлаводы — 950 тысяч, а ёсць яшчэ сад, рыбная гаспадарка... На працадзень калгаснікі атрымаюць па рублю грашыма і па два кілаграмы збожжа (гэта акрамя розных іншых прадуктаў). Уведзена штомесячнае грашовае авансаванне.

Людзі жывуць багата. Калгаснікі будуюць сабе прыгожыя дамы, цяпер усё больш цагляныя, на тры-чатыры пакоі. Штогод спраўляюць навасёлле 20, а то і 30 сем'яў. Я заходзіла да многіх калгаснікаў. У іх кватэрах новая мэбля, радыёпрыёмнікі, усё зяве чысцінёй, многа кветак, ни палічках і этажэрках кнігі. Калгаснікі набылі сабе звыш ста тэлевізараў, больш пайсотні матацыклаў. Трывала ўвайшлі ў быт пральныя і швейныя машыны, а веласіпед ёсць ледзь не ў кожнага школьніка.

У побыт калгаснікаў уваходзяць новыя святы і звычаі. Сёлета, напрыклад, адбылася маёўка ва ўрочышчы Марцэлін — цудоўным маляўнічым кутку прыроды. Гэта было сапраўды народнае гулянне з захаваннем традыцый першых маёвак. Спявалі рэвалюцыйныя песні, ярка гарэлі тры вогнішчы — сімвал пераемнасці трох пакаленняў. Штогод адзначаецца ў калгасе свята вясны і працы. У гэты дзень адбываецца парад магутнай калгаснай тэхнікі. Ідуць трактары, камбайны і іншыя машыны, упрыгожаныя сцягамі і рапартамі працоўных перамог. Наладжваюцца спартыўныя спаборніцтвы, канцэрты мастацкай самадзейнасці.

Хораша прайшло традыцыйнае свята зімы. Былі тут і Снягурачка, і Дзед Мароз, і розныя іншыя казачныя героі. Пастараліся работнікі культуры, калгасныя камсамольцы, 12 троек і вялізныя трактарныя сані з удзельнікамі самадзейнасці праехалі па вуліцах Брэста, а пасля цэлы дзень вазілі дзяцей у парку. У дзень Перамогі 350 калгаснікаў на васьмі аўтобусах паехалі ў Брэст. Там яны паглядзелі фільм «Вялікая Айчынная...», пабывалі ў Брэсцкай крэпасці, сустрэліся з абаронцамі крэпасці-героя, а пасля пабывалі ў Белавежскай пушчы.

Толькі сёлета калгаснікі глядзелі спектаклі Брэсцкага і Гродзенскага тэатраў, выступленні артыстаў Ленінградскага і Кіеўскага цыркаў. Да іх з канцэртам прыязджаў хор імя Пятніцкага, а неўзабаве адбудзецца канцэрт Дзяржаўнага народнага хору пад кіраўніцтвам Генадзя Ціговіча.

Калгас не шкадуе сродкаў на культуру — будуе клубы і чырвоныя куткі, абсталёўвае іх прыгожай мэбляй. Запрошаны мастак, каб ён афармляў наглядную агітацыю ў брыгадных клубах, дбаў аб тым, каб ва ўстановах культуры заўсёды было прыгожа. Для самадзейных артыстаў пашыты касцюмы. Мясцовы хор паспяхова выступіў на трэцяй Дэкадзе народнай творчасці ў Мінску.

Душою ўсяго новага, што нараджаецца ў калгасе, з'яўляецца старшыня праўлення Уладзімір Лявонцьевіч Бядуля — энергічны чалавек, добры арганізатар. Дзесяць год працуе ён тут старшынёй. Адсталая ў мінулым гаспадарка цяпер выйшла ў лік перадавых не толькі ў раёне, але і ў вобласці.

Людзі жывуць у калгасе не толькі сённяшнім днём. Як сапраўдныя гаспадары, яны плануюць сваё зайтра.

Нядаўна па ініцыятыве рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва» ў праўленні калгаса сабраўся актыў — брыгадзіры, загадчыкі ферм, работнікі культуры, члены праўлення, камсамольцы, дырэктары школ, механізатары, каб абмяняцца думкамі, якой будзе пяцігодка культуры калгаса. Гаворка была жывой, цікавай, выказваліся прапановы, што трэба зрабіць, каб у бліжэйшыя гады рашуча ўзняць культуру калгаснай вёскі.

Карэспандэнт газеты запісаў асноўныя думкі некаторых прамоўцаў. Іх мы і прапануем увазе чытачоў.



Свята вясны і працы ў калгасе. На парад ідзе магутная калгасная тэхніка...

Мікалай АНДРАСЮК,

сакратар парткома калгаса

— Гаворка ідзе ў нас пра сённяшні дзень і пра нашу блізкую будучыню. Пяць год — невялікі тэрмін, зрабіць жа мы павінны многа, асабліва ў сферы духоўнай. Наша задача — узняць культурны ўзровень калгаснай вёскі, каб яна не адставала ад горада.

Якое шырокае поле дзейнасці адкрываецца тут для нашых культработнікаў! Калгаснікі імкнуцца пазнаёміцца з лепшым вопытам гаспадарання, з дасягненнямі навукі, навінкамі мастацкай літаратуры. Лепшыя культасветустановы рэспублікі выкарыстоўваюць разнастайныя формы папулярызацыі кніг сярод сельскіх чытачоў. На жаль, нашы клубныя бібліятэкі гэтую работу недаацэньваюць, а сельскія бібліятэкі (іх у нас дзве) не паказваюць прыклад, не вучаць загадчыкаў брыгадных клубаў, як лепш прапагандаваць кнігу.

У новай пяцігодцы мы павінны дамагчыся, каб кніга стала другам кожнага калгасніка і асабліва моладзі, памочнікам у вялікай справе будаўніцтва камунізма.

Горкі марыў аб тым часе, калі прыгажосць стане адметнай рысай нашага жыцця. А што робім мы, каб паэзія, музыка, карціны сталі патрэбай душы чалавека? Вельмі мала. Гэты працэс у нас пакуль што адбываецца стыхійна. Праўда, праўленне калгаса не шкадуе сродкаў на канцэрты, спектаклі. Калгаснікі глядзяць усе прэм'еры Тэатра імя Ленінскага камсамола Беларусі і спектаклі многіх калектываў, што прыязджаюць на гастролі ў Брэст. Радаснай падзеяй для нас было выступленне на нашай зямлі ў Чапялях славутага хору рускай песні імя Пятніцкага. Нехта з нашых дасціпных калгаснікаў трапна пажартаваў: адбываюцца гастролі Масква—Чапялі—Чыкага—Нью-Йорк, маючы на ўвазе, што хор у наступным годзе паедзе ў Амерыку.

У нас ёсць жаночы савет, які ўзначальвае загадчыца фермы Антаніна Плясун. Хацелася б, каб нашы актывісткі разам з работнікамі культуры і медыцыны разгарнулі спаборніцтва за самыя чыстыя ў калгасе дом і сядзібу, за ўтульнасць і прыгажосць у кожнай кватэры. Усё, што акружае савецкага чалавека, павінна быць прыгожым і эканамічным.

У калгасе трэба садзіць больш кветак, каб цвілі ў нас ружы, вяргіні, цюльпаны, ляўконіі не толькі вакол новага Палаца культуры (а я ўпэўнены, што свае плантацыі ружаў і іншых кветак у нас абавязкова будуць), а і ля кожнага дома. Гэта так упрыгожыць і нашы вёскі і наша жыццё.

Эстэтычнаму выхаванню працаўнікоў вёскі нам трэба аддаваць значна больш увагі, бо пачуццё прыгожага не набудзеш у магазіне, як вазу ці моднае адзенне.

Анатоль НІЧЫПАРУК,

галоўны аграном калгаса

— Як для ўсёй краіны, так і для нашага калгаса новая пяцігодка адкрывае новыя гарызонты. Дырэктывы пяцігадовага плана развіцця народнай гаспадаркі прадугледжваюць павялічыць вытворчасць збожжа на 30 працэнтаў. Вёска атрымае намнога больш тэхнікі, мінеральных угнаенняў, электраэнергіі. Гэта забяспечыць высокія тэмпы развіцця ўсіх галін сельскай гаспадаркі.

А якія абрысы набудзе пяцігодка культуры калгаса? Кожная вёска будзе мець брыгадны клуб ці чырвоны куток, лазню. Калгас наш электрыфікаваны, праведзены радыё, тэлефон, і мы да гэтага прызвычаіліся: здаецца, так было спрадвеку.

З нецярплівасцю мы чакаем той дзень, калі адчыняцца дзверы нашага новага Палаца культуры. Але трэба, каб ён стаў сапраўднай калгаснай акадэміяй культуры, праваднікам і прапагандыстам новага і перадавога ў жыцці. Трэба, каб у Палацы працаваў універсітэт культуры, у якім бы мы і нашы дзеці маглі вывучаць і музыку, і літаратуру, і мастацтва. У нас ёсць хор, а трэба сабраць аматараў драматычнага мастацтва і стварыць свой, калгасны тэатр. Няхай выязджае на гастролі ў суседнія вёскі і раёны. Нямала ў нас і радыёаматараў — і іх трэба аб'яднаць, няхай і яны паспрабуюць свае сілы ў гэтай тонкай справе. Вельмі патрэбна нам музычная школа.

Плануем мы на пяцігодку пабудаваць новы пасёлак з усімі выгодамі для чалавека. Будуць добраўпарадкоўвацца дарогі. Але галоўны наш клопат — гэта выхаванне актыўнага будаўніка камунізма. Тут ёсць у нас яшчэ нямала сур'ёзных недахопаў. Нашы работнікі культуры далёкія яшчэ ад працоўных спраў калгаса. У клубах, чырвоных кутках не заўсёды ўбачыш «маланку» пра тых, хто сёння напередадзе, неахайна вядуцца дошкі сацыялістычнага спаборніцтва. А ўсё гэта мае вялікае выхаваўчае значэнне для нашай моладзі.

Душы людскія наш абавязак выхоўваць штодзённа: на працы, у клубе, на вуліцы, у школе. Тады не будзе прыкрых выпадкаў п'янства і хуліганства. Нас не павінна супакойваць, што гэта рэдкія выпадкі. Калі яны ўсё яшчэ ёсць, значыць, мы нешта ўпусцілі ў выхаваўчай работе.

Ліда ЗІНЬКОВА,

загадчыца Бардзёўскага клуба, сакратар камсамольскай арганізацыі калгаса

— Моладзь цягнецца да гарадской культуры, добраўпарадкаванага быту. Нам жа тут яшчэ трэба зрабіць нямала. Дрэнныя нашы дарогі. Паспрабуй дабрацца з Бардзёўкі і Туміна ў цэнтр калгаса. Восенню і вясною без гумавых ботаў кроку не ступіш. У наш пяцігадовы план абавязкова трэба ўключыць будаўніцтва і рамонт дарог, іх азеляненне.

Настаў час звярнуць больш увагі на матэрыяльную базу культуры. Кожны клуб павінен мець тэлевізар, баян, магнітафон, эпідыяскоп. Аднымі шашкамі ды даміно цяжка весці культасветработу на сучасным узроўні, калі трэба прапагандаваць дасягненні навукі, тэхнікі, культуры, перадавога вопыту. Калі мы хочам, каб людзі хадзілі ў клубы, мы абавязаны стварыць ім умовы для адпачынку. У нас новы клуб. Калгас набыў добрую мэблю. У клубе чыста, утульна, а сродкаў тэхнічнай прапаганды (акрамя прыёмніка) мы не маем. Мала ў нашай бібліятэцы кніжак.

Зоя СЕВАСЦЬЯНЧУК,

загадчыца бібліятэкі, грамадскі намеснік старшыні калгаса па культуры

— Як я ўяўляю пяцігодку культуры калгаса? Сёлета мы справім цудоўнае навасёлле: уступіць у строй наш прыгажун са шкла і бетону — новы Палац культуры. Ён будзе той лабараторыяй, дзе нараджаюцца і добры настрой у людзей, і добрыя планы культасветработы.

У нас харошая традыцыя — урачыста адзначаць рэгістрацыю нованароджаных, камсамольскія вяселлі. Напомню, што сёлета адбылося сем акцябрын і тры вяселлі. Добра прыжыліся свята зімы, навагоднія балі. Вясною мы правялі маёўку, і, як вы самі ведаеце, яна нам удалася. Думаю, што трэба ўкараніць у наш быт свята залатой восені, калі падводзіцца плён руплівай працы калгаснікаў.

Ва ўздыме культуры калгаснай вёскі вялікая роля належыць гораду і нашым творчым арганізацыям — саюзам кампазітараў, мастакоў, пісьменнікаў, тэатрам, канцэртным арганізацыям. І тут патрэбны не столькі гастралёрскія наезды (хаця кожнаму такому госцю мы шчыра ўдзячны), колькі нейкая прадуманая сістэма гэтай дапамогі. Мы хочам жыць па-гарадскому, і нам не абысціся без мастака, архітэктара, музыканта, пісьменніка, артыста, без іх кваліфікаваных парад, творчых сустрэч і гаворкі пра вялікі свет мастацтва.

Мы пачалі збіраць матэрыялы для музея гісторыі нашага калгаса. Да 50-годдзя Савецкай улады музей наш гасцінна сустрэне першых наведвальнікаў.

Вольга ГРЫЦЦУК,

брыгадзір

— Слухаю нашу гаворку, і сэрца поўніцца радасцю, што сённяшнія нашы клопаты не толькі пра хлеб надзённы. На парадку дня — пяцігодка культуры калгаса, а пра хлеб мы ўжо даўно не бядуем. Цяпер у кожным доме поўны дастатак. Калгаснікі булкі пякуць, пірагі, ды мудрасці гэтай вучацца па кнігах. Звычайна не прынята, каб у вёсцы аб'яўлялі конкурс на лепшы каравай. А мы толькі што падвялі вынікі такога спаборніцтва. Нашы калгасніцы — майстры на ўсе рукі.

Трэба больш клапаціцца пра іх адпачынак і быт. Наша вёска немалая — у ёй 125 двароў. А клуба няма, бо тое, што мы сёння маем, ніяк не назавеш установай культуры. Лічу, што клуб у брыгадзе трэба будаваць як мага хутчэй. Прашу гэтую будоўлю лічыць першачарговай у пяцігадовым плане развіцця культуры калгаса.

Аляксей СЕВАСЦЬЯНЧУК,

сакратар Камянецкага райкома камсамола

— Сёння на гэтай канферэнцыі правільна крытыкавалі работнікаў культуры, у большасці сваёй камсамольцаў. Недахопы ў іх рабоце — гэта адсутнасць ініцыятывы, дзелавітасці, умення самастойна вырашаць многія пытанні, не чакаючы напамінку. Загадчыкі клубаў і бібліятэк абавязаны больш клапаціцца аб павышэнні кваліфікацыі і ведаў моладзі, умела арганізоўваць яе адпачынак, паляпшаць быт маладых калгаснікаў, ствараючы тым самым добры настрой і жаданне працаваць яшчэ лепш.

У калгасе многае робіцца, каб моладзь адпачывала добра, узбагачала сябе ведамі. Развіваюцца фізкультура і спорт, футбольная каманда вядома не толькі ў раёне, але і ў вобласці, адбываюцца спаборніцтвы лёгкаатлетаў, веласіпедыстаў, гонкі на матацыклах. Але каб фізкультура развівалася і далей, мала мець адно футбольнае поле. Такому калгасу, як «Савецкая Беларусь», трэба ў новай пяцігодцы пабудаваць стадыён з комплексам спартыўных збудаванняў, мець водны басейн і добраўпарадкаваны пляж.

Уладзімір БЯДУЛЯ,

старшыня калгаса, дэлегат XXIII з'езда КПСС

— Абмеркаванне пяцігодкі культуры калгаса — гэта своеасаблівы працяг вялікай гаворкі, што адбылася на XXIII з'ездзе партыі, але толькі ў нашых канкрэтных умовах.

Багатае і разнастайнае жыццё вёскі, вялікае імкненне людзей да ведаў, культуры. Трактарыст, камбайнер, жывёлавод, аграном, заатэхнік, інжынер, медыцынскі работнік, настаўнік, ветфельчар — вось людзі, якія вызначаюць прафесіянальны склад сённяшняй вёскі. Цікава нагадаць дзве лічбы: у 1939 годзе на тэрыторыі нашага калгаса было тры інтэлігенты, якія мелі вышэйшую адукацыю, а сёння іх ужо больш як сто чалавек.

Якасныя змены, што адбыліся ў нашым калгасе, вымагаюць ад нас больш клапаціцца пра культуру і быт працаўнікоў вёскі. Гордасць нашай пяцігодкі — гарадскі пасёлак, будаўніцтва якога мы ўжо распачалі. Над яго планіроўкай працуе сёння архітэктар Леанід Маскаленіч. За пяцігодку пабудуем дзесяць двухпавярховых васьмікватэрных жылых дамоў з усімі выгодамі — газам, водаправодам, каналізацыяй. Два ўжо будуюцца. У іх сёлета справяць навасёлле 16 калгаснікаў і спецыялістаў.

Цэнтр новага пасёлка — Палац культуры з гляцельнай залай на 520 месц, з шыроказкраннай кінаўстаноўкай, фае, пакоямі для работы самадзейных гурткоў, бібліятэкай, чытальнай залай, спецыяльнай залай для правядзення новых абрадаў. Гэта ў поўным сэнсе слова сучасны будынак, і абсталёўваць яго мы будзем таксама трымаючы курс на сучаснае разуменне прыгожага.

Вакол Палаца культуры разаб'ём сквер, пасадзім кветкі, без іх не можа быць сапраўднага хараства. У гэтым я цалкам згодны з сакратаром парткома.

Каб жыць па законах прыгажосці і ўмела пашыраць яе, патрэбен нам свой мастак-архітэктар, які б ажыццяўляў архітэктурны нагляд за будаўніцтвам, даваў парады калгаснікам, як зрабіць сваю кватэру ўтульнай і прыгожай.

У пасёлку пабудуем помнік воінам-вызваліцелям, якія аддалі сваё жыццё за нашу мірную працу, за нашу пяцігодку культуры. Плануем будаўніцтва камбіната бытавых паслуг, пошты. А лазню, магазін, фельчарска-акушорскі пункт, сталовую мы пабудавалі.

Адначасова з будаўніцтвам гарадскога пасёлка мы не забываем пра заўтрашні дзень нашых дванаццаці вёсак. У іх жывуць і працуюць людзі, якія заслугоўваюць не меншых клопатаў. У нас ужо ёсць тры лазні, сёлета пабудуем дзве — у Ляску і Тумені, у наступным годзе — яшчэ дзве — у Бардзёўцы і Вярхах.

Расце культура вёскі, растуць запатрабаванні калгаснікаў. Гэта вымагае ад праўлення калгаса, партыйнай і камсамольскай арганізацый узмацніць ідэалагічную, выхаваўчую работу. Мала мець клуб, трэба яшчэ — і гэта галоўнае, — каб у яго было цікава хадзіць, каб ён узбагачаў і душу і сэрца чалавека. Аб гэтым мы сёння тут гаварылі нямала.

Прапановы аб будаўніцтве аб'ектаў культуры, якія выказваліся тут, мы, я думаю, прымем да няўхільнага выканання. Сёлета, акрамя Палаца культуры, будзе завершана будаўніцтва сёмага ў калгасе брыгаднага клуба. Рады паведаміць, што клуб у Лумні, пра які гаварыла Вольга Грыцук, будзе пабудаваны ў юбілейным 1967 годзе. Ужо заключаны дагавор з Міжкалгасбудам.

Падтрымліваю прапанову пра будаўніцтва стадыёна і купальнага басейна. Мне здаецца, што тут многае могуць зрабіць наша моладзь, камсамольцы. Лічу, што стадыён мы пабудуем ў 1967 г., а басейн — у 1968 г.

А цяпер пра дарогі. Сапраўды дрэнныя яны ў нас. Да 50-годдзя Савецкай улады трэба добраўпарадкаваць усе дарогі. Наша першачарговая задача — ужо сёлета адрамантаваць дарогі на Тумін і Бардзёўку. Праўленне калгаса адпускае на гэта ў чэрвені — ліпені дзве тысячы рублёў.

І азеляніць дарогі трэба. Давайце дагаворымся, што кожная брыгада штогод садзіць сто дрэў. Па калгасу гэта будзе тысяча дрэўцаў. За пяцігодку мы, такім чынам пасадзім пяць тысяч дрэў, гэта акрамя кустоў і кветак. Абавязацельства будзем лічыць выкананым, калі кожнае дрэва будзе захавана і добра дагледжана. Няхай школьнікі будуць шэфамі нашых зялёных сяброў.

Ніхто не гаварыў тут пра адпачынак людзей. Думаю, што гэты пункт трэба ўнесці ў наш пяцігадовы план. Летась мы паслалі на курорты краіны больш як пяцьдзесят калгаснікаў. Прапаную штогод накіроўваць за кошт калгаса шэсцьдзесят лепшых працаўнікоў у санаторыі і дамы адпачынку. Акрамя таго, пяцьдзесят нашых калгаснікаў штогод могуць адпачываць па турысцкіх путёўках. Ёсць у нас надзея — набыць для калгаса аўтобус. Тады справа будзе вырашацца прасцей: садзіся ў аўтобус і падарожнічай па родным краі, Крыме, Каўказе, Закарпацці.

А як жа нашы дзеці? Іх нельга забываць. Няхай штогод за кошт калгаса адпачываюць у піянерскім лагеры не менш пяцідзесяці школьнікаў. Для самых маленькіх пабудуем дзіцячы сад і яслі.

Так мне ўяўляецца наша пяцігодка культуры з тымі дадаткамі і заўвагамі, пра якія мы сёння гаварылі тут. Думаю, што гэтае пытанне яшчэ трэба абмеркаваць у кожнай брыгадзе, каб улічыць усе дэталі, а пасля ўжо — на пасяджэнні праўлення мы канчаткова зацвердзім пяцігадовы план развіцця культуры і быту калгаса.

□ □ □

Я пакідала калгас радасна ўзрушаная. Усе, хто выступаў на канферэнцыі, так хораша і пераканаўча гаварылі пра сваю пяцігодку культуры, што я ўжо яскрава ўяўляла і новы гарадскі пасёлак з цудоўным Палацам культуры ў цэнтры, вакол якога шуміць зялёная лістота маладога скверу, і помнік героям Вялікай Айчыннай вайны, і заасфальтаваную вуліцу, уздоўж якой свецяцца агнямі двухпавярховыя дамы-катэджы. А недзе далей — водны басейн з пляжам...

Мы прывыклі ўсе клопаты аб сельскай культуры зводзіць да работы клубаў, да лекцый, дакладаў, канцэртаў мастацкай самадзейнасці. Гэта сапраўды надзвычай важнае звяно ў агульным паходзе за культуру калгаснай вёскі. У калгасе ж «Савецкая Беларусь» у гэтае разуменне ўнеслі, як кажуць, істотныя папраўкі. Пытанні ўздыму культуры вёскі тут рашаюць комплексна. Не толькі клубы, але і будаўніцтва катэджаў, і добраўпарадкаваныя вуліцы, дарогі, і многае іншае, без чаго чалавек сёння не можа абысціся.

Мне здаецца, што ў гэтым комплексе клопатаў пра гарадскія рысы вёскі не апошняе месца павінна займаць мастацкая творчасць народа, якую важна развіваць, падтрымліваць. На жаль, народныя ўмельцы не ўсюды карыстаюцца ў нас належнай увагай, на іх працу часам глядзяць як на нейкае дзівацтва. Тчэ жанчына, ну і няхай сабе бавіць час за кроснамі. А тое, што яна стварае непаўторную прыгажосць у сваіх посцілках, ручніках, настольніках — на гэта мала хто звяртае ўвагу.

У калгасе «Савецкая Беларусь» многія жанчыны ўмеюць ткаць, маюць кросны. Можа, варта было б зімою правесці такі вопыт: найбольш умелым ткачыхам даць заказ ад праўлення калгаса? Няхай жанкі выткуць спачатку хоць бы для аднаго клуба парцьеры на дзверы і вокны, заслону для сцэны, настольнікі і палавікі. Гэта ўпрыгожыць брыгадны клуб, зробіць яго непадобным на іншыя. Тады і калгаснікі самі пераканаюцца, чым лепш упрыгожыць сваю кватэру: ці вышыўкамі крыжыкам розных аленяў, дзівосных наездніц-прынцэс, казачных замкаў, ці вытканым ручнікам і дываном-посцілкай.

У калгасе аб'яўляюць конкурс на лепшы каравай, на самую прыгожую першамайскую калону. Няхай будзе конкурс і на лепшы клуб, упрыгожаны рукамі народных умельцаў. Зазначу, што гэтыя унікальныя рэчы патрэбны будуць і калгаснаму музею, які неўзабаве тут адкрыецца.

Мала хто з калгаснікаў сёння задаволены работай культасветустаноў. Аб гэтым многа гаварылі на канферэнцыі. Відаць, справа тут не толькі ў адсутнасці ініцыятывы. Загадчыкамі клубаў працуюць у калгасе выпускнікі школ. Ведаў спецыяльных яны не маюць, і ніхто іх не вучыць працаваць.

У калгасе ёсць спецыялісты сельскай гаспадаркі — аграномы, заатэхнікі, ветфельчары, механікі. Усё гэта вельмі добра. Многія калгаснікі, у тым ліку і старшыня калгаса, завочна вучацца ў сельгастэхнікумах і інстытутах. Але калгас не паслаў ніводнага свайго прадстаўніка на вучобу ў культасветвучылішча, на рэспубліканскія курсы кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці. Патрэба ж у гэтым надзвычай вялікая. Калгас мае мастацкага кіраўніка хору, чалавека са спецыяльнай сярэдняй адукацыяй. Але няма кіраўнікоў духавога аркестра, драматычнага і танцавальнага калектываў. Калі глядзець наперад, то без гэтых спецыялістаў ужо не абыдзешся.

На вёсцы жыве і працуе вялікі атрад інтэлігенцыі. Хацелася, каб яна больш актыўна і па-сапраўднаму творча памагала калгаснікам ажыццяўляць іх планы культурнага будаўніцтва, духоўнага росту людзей.

Хацелася сказаць і яшчэ аб адным. На пяцігодку калгас плануе пабудаваць камбінат бытавых паслуг, дзе будуць швейнае і шавецкае атэлье, цырульня, майстэрні па рамонту тэлевізараў, радыёпрыёмнікаў, гадзіннікаў. Ужо сёння калгасу трэба паклапаціцца аб сваіх кадрах. Сёлета толькі сярэднюю школу заканчвае 30 чалавек, некалькі дзесяткаў заканчваюць васьмігодку. Сярод іх знойдуцца ахвотнікі вучыцца ў прафесіянальна-тэхнічных вучылішчах. Гэта будзе так добра, калі выпускніца сярэдняй школы стане добрым мадэльерам і будзе шыць сваім аднавяскоўцам самыя модныя, прыгожыя сукенкі, паліто, будзе, што называецца, заканадаўцам мод, прыгажосці.

Зроблена ў калгасе многа, але яшчэ больш трэба зрабіць, каб выканаць рашэнні XXIII з'езда партыі. Планы ў калгаснікаў вялікія, і верыш, што яны будуць здзейснены, бо жывуць тут харошыя, працавітыя людзі.

Я. ДАНСКАЯ,
спец. кар. «Літаратуры і мастацтва».



У цэнтры новага гарадскога пасёлка вырастае прыгажун са шкла і бетону — Палац культуры. Сёлета ён гасцінна расчыніць дзверы.

Калгасны хор — удзельнік трэцяй Дэкады народнай творчасці. Калектыў пад кіраўніцтвам М. Мілкоўскага спявае беларускія народныя песні і песні савецкіх кампазітараў.

У запаведна-паляўнічай гаспадарцы «Белавежская пушча» адбылася ўсесаюзная нарада, арганізаваная Беларускім аддзяленнем Усесаюзнага батанічнага таварыства. Яе ўдзельнікі — вучоныя Беларусі, Масквы, Ленінграда, Кіева, Літвы, Латвіі, Эстоніі і іншых раёнаў краіны абмеркавалі пытанні, звязаныя з асновамі рацыянальнага выкарыстання і аховы раслённага свету нашай Радзімы. Былі заслуханы паведамленні акадэміка АН БССР прафесара І. Д. Юркевіча, дырэктара запаведна-паляўнічай гаспадаркі кандыдата сельскагаспадарчых навук Ул. С. Раманава, буйнейшага лугавода краіны акадэміка Усесаюзнай акадэміі сельскагаспадарчых навук імя Леніна І. В. Ларына і іншых.

На здымку — удзельнікі нарады знаёмяцца з раслінным светам Белавежскай пушчы.

Фота В. ГЕРМАНА. (БЕЛТА).

НАПЯРЭДАДНІ РОЗЫГРЫШУ

30 чэрвеня ў Маскве адбудзецца тыраж выйгрышаў другой Усесаюзнай мастацкай латарэі. Будзе разыграна 208 500 выйгрышаў — арыгінальных твораў савецкіх мастакоў, кніг па выяўленчаму мастацтву, прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога ўбрання інтэр'ера. Рэдакцыя газеты «Літаратура і мастацтва» звярнулася да члена аргкамітэта другой Усесаюзнай мастацкай латарэі Г. Зельскага і папрасіла яго расказаць пра падрыхтоўку да латарэі.

— З творамі выяўленчага мастацтва,—сказаў Г. Зельскі, — нашы гледачы знаёмяцца ў асноўным толькі на мастацкіх выстаўках. Гэтае знаёмства абмяжоўваецца праглядам арыгінальных твораў жывапісу, скульптуры і графікі. Аматары мастацтва не заўсёды могуць набыць арыгіналы мастацкіх твораў. Гэтую праблему ў пэўнай ступені вырашае мастацкая латарэя. За невялікую плату ўладальнікі «шчаслівых» білетаў могуць аказацца ўласнікамі арыгінальнай настольнай скульптуры, вырабаў са шкла, фарфору, керамікі, карцін, гравюр.

На другой Усесаюзнай мастацкай латарэі, у адрозненне ад першай, якая праводзілася ў 1964 годзе, выйграшаў будзе прыкладна ў шэсць разоў больш. Побач з творамі выяўленчага мастацтва будуць разыграны і прадметы утылітарнага прызначэння — мэблевыя гарнітуры, сервізы, дэкаратыўныя тканіны, дываны і ювелірныя вырабы.

Беларускія мастакі зрабілі значны ўклад у фонд выйгрышаў латарэі. Свае арыгінальныя творы прадставілі народны мастак БССР В. Цвірка, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР П. Масленікаў, мастакі Я. Ціхановіч, Я. Красоўскі, В. Жолтак, Л. Лейтман, А. Гугель і іншыя. Тыя, хто прымуць удзел у розыгрышы, могуць выйграць гравюры і афорты вядомых беларускіх графікаў С. Геруса, Л. Рана, Б. Заборава і іншых, прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва таленавітых беларускіх мастакоў-прыкладнікоў Л. Багданава, Л. Мягковай, Ул. Мурахвера, С. Раудве і інш., якія атрымалі прызнанне на міжнародных выстаўках у Токіо і Генуі.

Значэнне праводзімай латарэі цяжка пераацаніць. Апрача таго, што тысячы людзей набудуць творы мастацтва, выручаныя ад распрададзенай латарэі грошы пойдуць на будаўніцтва выставачных павільёнаў, музеяў. Укладзеныя ў латарэю сродкі вернуцца савецкім людзям у выглядзе культурных каштоўнасцей.

У нашай газеце паведамлялася ўжо, што брэсцкі ансамбль «Радасць» будзе ўдзельнікам фестывалю танцавальнага фальклору ў славацкім горадзе Стражніца. Днямі самадзейны калектыў выехаў у Чэхаславакію. Гэты здымак зроблены на адной з рэпетыцый напярэдадні ад'езду. Брэсцкія танцоры выконваюць «Малдаўскую сюіту».

ВАЧЫМА ЮНЫХ

Рэдакцыя газеты «Пионерская правда» і Саюз савецкіх таварыстваў дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі прапанавалі дзецям усяго свету прыслаць свае малюнкі на міжнародны конкурс «Мая краіна—мой дом».

70 тысяч работ было атрымана арганізатарамі конкурсу з 42 краін. Цяпер 1500 з іх выстаўлена ў залах Акадэміі мастацтваў СССР у Маскве.

У апошнія гады наша цікавасць да дзіцячага малюнка змянілася да лепшага. Выклікае захапленне ўсё больш не наіўнасць, забаўная няўмеласць дзяцей, а тое, як у юным чалавеку фарміруецца мастак, адбываецца адкрыццё прыгожага.

На выстаўцы паўстае жыццё сучаснага чалавецтва. Мяняюцца ландшафты: вечназялёныя сцяжынні, заснежаныя палі Расіі, горы Балгарыі і вуліцы заходнеэўрапейскіх гарадоў. Усюды жывуць людзі. Яны розныя і розныя іх клопаты. Але тое, што іх усіх аб'ядноўвае, добра выказана ў работах юных мастакоў. Гэта — пачуццё жыцця, жаданне міру і шчасця, справядлівасці.

Для юнага мастака не існуе «проста» колеру або руху пэндзля. Кожная пляма, кожны дотык фарбы да паперы напоўнены для яго патаемным сэнсам. Жыва і выразна малюе васьмігадовы француз Анры Пале. Хлопчык фантазіруе, творыць свет па-свойму, нанава. Але як многа ў яго малюнку сапраўднага, убачанага ім самім.

На лінагравюрах японца Такэміцу Хасадзава «Праполка градак» і «Касьба рысу» адлюстравана барацьба чалавека за жыццё, за ўрадлівасць зямлі.

А маленькага кіпрыёта Дэметрыёса Папахрыстадулу хвалююць іншыя падзеі. Ён малюе дужых юнакоў з высакароднымі і светлымі позіркамі. У цяжкі для радзімы час яны ўступаюць у армію прэзідэнта Макарыёса.

У савецкім раздзеле амаль няма работ, якія вылучаюцца імкненнем да фатаграфічнага падабенства аб'ёмаў і прапорцый. Юныя мастакі жывуць у сваіх вобразах, шчыра дзелячыся сваімі марамі і эмоцыямі. Таму так прыцягваюць увагу работы, прысвечаныя вялікім і важным тэмам. Іх аўтары, не трацячы прымет узросту, паказваюць сябе разумнымі, удумлівымі.

Сярод такіх работ запамінаецца акварэль чатырнаццацігадовага Юры Грыгор'ева «Ленін на адпачынку», «Камунар» Вовы Шацава, «Уборка збожжа» Майсея Хана.

Шасцігадовы Валодзя Сараб'янаў дэманструе незвычайны талент каларыста. Ён піша маслам. «Шэры дзень», «Дрэвы»—гэта маленькія навелы, прасякнутыя тонкім і лірычным настроем.

У работах Олі Жылінскай, Рыты Корсакавай і многіх іншых савецкіх дзяцей разгортваецца панарама іх свету — сур'ёзнага і дзіўснага, штодзённага і небудзённага.

Жыццё, убачанае вачыма юных, стала бліжэйшае і цікавейшае.

Іван КУПЦОЎ,
мастацтвазнаўца.
(АДН).

ПАСМЯРОТНАЯ МАСКА ПАЭТА

Мікалай Аляксеевіч Нікіфараў — вядомы тамбоўскі калекцыянер, майстар экслібрысу і дырэктар гарадскога літаратурнага музея, створанага ў Тамбове на грамадскіх асновах. Пяру Нікіфарава належыць і цікавая кніжка «Пошукі і знаходкі», якая ўключае яго апавяданні пра здзіўляючыя здарэнні, што суправаджаюць яго пошукі рэдкіх рэчаў, якія склалі калекцыю. Яго нарыс «Пасмяротная маска паэта», які АДН прапануе чытачам, з'яўляецца па сутнасці працягам кніжкі М. А. Нікіфарава.

Большасці адукаваных людзей вядома імя Еўдаксіі Фёдараўны Нікіцінай, яе славутыя літаратурныя «суботнікі», а таксама цудоўны збор рэчаў, звязаных з імёнамі рускіх літаратараў, рукапісаў пісьменнікаў, іх партрэтаў з аўтографамі. Гэты выдатны знаўца рускай славеснасці была сябрам многіх выдатных літаратараў.

У зборы Нікіцінай самае вялікае і пачэснае месца займаюць экспанаты, звязаныя з жыццём і творчасцю А. С. Пушкіна, чыё імя для гаспадыні свяшчэннае: сапраўдныя прыжыццёвыя партрэты, скульптуры, камінныя гадзіннікі, ціканне якіх чуў Аляксандр Сяргеевіч, і многае іншае. Блізкія сябры Еўдаксіі Фёдараўны не без падстаў называюць яе кватэру «Аляксандраградам» — асяродкам любві да паэта, яго творчасці.

Над уваходнымі дзвярыма вялікай залы ў цэнтры вісіць гордасць «Нікіцінскай пушкініяны» — партрэт паэта, напісаны мастаком Урубелем.

З нядаўняга часу месца побач з урубелеўскім шэдэўрам заняла... Але дазвольце расказаць гісторыю гэтага экспаната з пачатку.

Восенню сорак сёмага года я наведаў Ленінград. Як заўсёды, спыніўся ў стрыечнай сястры на Выбаргскай старане. Сястра цікавіцца маім заняткам, любіць слухаць расказы пра пошукі і знаходкі, але ведае, што я не пярплю, калі ў мяне «выпытваюць» навіны, і чакае, пакуль я сам пачну развязваць «вузельчыкі» з гісторыямі...

Яна мые пасуду, я стаю, прыпёршыся да вушака дзвярэй, і расказваю пра адну з апошніх знаходак — скульптуру «Барацьба тыгра з кракадзілам». У пакоі не спяшаючыся корпаецца ля ацяпляльных батарэй пажылы слесар. Я думаю, што ён не слухае мяне, заняты сваёй справай і сваімі думкамі. Але калі я скончыў, дзядзька Сярожа — так звалі слесара — раптам сказаў:

— Я таксама знайшоў неяк кавалак ад статуі,—твар ужо вельмі падобны на Пушкіна. Пасля вайны, калі разбіралі разбураныя будынкі. Вочы заплюшчаныя... толькі твар без патыліцы і шыі. Ляжаў ён ў каробцы са шклом на чорным аксаміце. Шкло разбіта было. Аксаміт стары разлезся. Прынёс я гэта дадому. На камод паставіў, шукаў—можа, астатняе дзе было. Ужо потым уцяміў: не магло быць: Навошта ў каробцы асобна хаваць...

Я пацікавіўся, дзе ён падабраў сваю знаходку, а ў галаве мільганула здагадка: ці не пра пасмяротную маску паэта ідзе гаворка?

— Ужо цяпер і не памятаю. Многа тады было разбураных будынкаў.

— А ці нельга паглядзець на вашу знаходку?

— Чаму ж нельга—можна. Жыву я недалёка—на Лясной. Тры мінуты хады.

Мы ў дзядзькі Сярожы. Яго жонка Тоня—ціхая, сціплая—правяла мяне ў пакой. Як толькі я ўбачыў «знаходку», радасна забілася сэрца: вядома, пасмяротная гіпсавая маска, да таго ж вельмі добра захавалася.

Пазней я ўстанавіў, што маска—аўтарскі адліў. На адваротным баку стаяла лацінская літара «Г» і дробны нумар адліву «№ 6». Шмат гадоў маска была маёй гордасцю...

У дні 50-годдзя «Нікіцінскіх суботнікаў» я быў членам юбілейнай камісіі. Бачыў бясконцы паток пісьмаў, тэлеграм, прывітанняў, бандэролей, пасылак у адрас Еўдаксіі Фёдараўны — адзнак прызнання яе шматгадовага подзвігу. Захацелася і мне падарыць ёй што-небудзь, вартае яе унікальнага збору. І што ж можна было прыдумаць лепшага, чым падарыць маску!

Мікалай НІКІФАРАЎ.

Па той бок

ЧУЖЫ ПОЧЫРК

Як пазнаць выдатную актрысу, калі няма магчымасці бачыць яе твар? Здаецца, наіўнае пытанне: вядома ж, па манеры ігры, па характэрных жэстах, характэрнай... Але... Усё гэта — не тое. Іранскі часопіс «Раушанфекр» знаёміць сваіх чытачоў з новым, амаль унікальным спосабам. Відаць, для выпрабавання новага спосабу гэта саліднае выданне аб'явіла конкурс на тэму: «Чый гэта бюст?» Часопіс апублікаваў фотаздымкі толькі гэтай часткі цела 12 кінаактрыс з сусветным іменем, у тым ліку Сафі Ларэн, Элізабет Тэйлар, Урсулы Андэрсен, Клаўдзіі Кардынале, Марлен Дзітрых... Кожны фотаздымак абазначаны адной з літар арабскага алфавіту.

Удзельнікі конкурсу павінны вызначыць, каму належыць той ці іншы бюст, і паставіць адпаведную літару пад прозвішчам актрысы на загадзя падрыхтаванай часопісам табліцы.

Вынікі гэтага конкурсу пакуль невядомыя. Невядомая таксама і колькасць яго ўдзельнікаў. Аднак можна з упэўненасцю сказаць, што сярод іранскіх чытачоў не так многа знойдзецца ахвотнікаў да гэтай гульні, якой ніколі не было ў Іране.

«МУЗЫКА» І... ЗАТЫЧКІ ДЛЯ ВУШЭЙ

Канцэрт «пігтродавай» музыкі, які адбыўся ў буйнейшай канцэртнай зале Капенгагена «К. Б. Хален» 7 красавіка гэтага года, быў апошнім. Калі паліцэйскі грузавік адвёз апошніх даведзеных да істэрыкі падлеткаў, дырэктар залы Крыстэнсен рашуча заявіў, што ад гэтага часу ён больш не мае намеру здаваць памяшканне для такіх музыкантаў.

Дацкая прэса пусцілася ў здагадкі. І на самай справе—чаму дацкім «пігтродам» забаранілі даманстраваць свае буянае «мастацтва» ў адзінай прыгоднай для гэтага зале сталіцы? Выйшла з моды? Зусім не. Фінансавыя меркаванні таксама не ідуць у разлік, бо на апошнім канцэрце было разбіта ўшчэнт усяго толькі каля ста крэслаў — вельмі мала ў параўнанні з іншымі аналагічнымі канцэртамі. Апрача таго, кошт разбітай мэблі кожны раз акуратна кампенсуецца ўладальнікам залаў. І толькі праз некаторы час журналістам удалося ўстанавіць сапраўдную прычыну незадаволенасці ўлад музычныма практыкаваннямі «пігтродаў». Справа, аказваецца, у тым, што буяная какафонія, якая выдаецца на Захадзе за навейшае дасягненне ў галіне музыкі, згубна дзейнічае не толькі на душы людзей, але і на іх... вушы! Слухачы... глухнуць, Глухнуць сур'ёзна і надоўга. Асабліва часта пакутуюць ад свайго ж мастацтва самі выканаўцы.

Само слова «пігтрод», якое азначае «калючы дрот», мае на мэце прымусова навязваць слухачу даўваанні. Адсутнасць мелодыі кампенсуецца ў такой музыцы дзікім, немым ровам, крыўляннем і ліхаманкавымі нервовымі дрыжыкамі рук і ног. Прычым, такая «музыка» падаецца ў залу абавязкова праз магутныя рупары. Як паказалі нядаўнія даследаванні дзіцячых урачоў, гітарыст з аркестра «пігтродаў» адчувае такое ўздзеянне на свае вушы, як быццам ён знаходзіцца побач з выхлапной трубой рэактыўнага самалёта, які дае «поўны газ». За чатыры гады знаходжання ў аркестры гітарыст амаль зусім аглух.

Эпідэмія «пігтродавай» музыкі, якая лютуе ў Даніі, кожны дзень прыносіць свой сумны плён: выпадкі страты слыху ў маладых людзей нікога ўжо не здзіўляюць. Найбольш прадбачлівыя людзі, перш чым пайсці на канцэрт, пачалі наведваць канторы страхавых кампаній, спрабуючы застрахаваць сябе ад страты слыху. Але дарэмна! «Рызыка застацца глухім ад «пігтродавай» музыкі такая вялікая, — заявіў карэспандэнту газеты «Б. Т.» адзін з кіраўнікоў «пігтродавых» аркестраў у Даніі П. Стэфенсен, — што ні адна кампанія не бярэцца нас страхаваць. Чатыры буйныя страхавыя кампаніі Даніі нам адмовілі. Такі ж адказ атрыманы ад страхавой фірмы «Лойд», у Лондане».

Якое ж выйсце? Здавалася б, што прасцей за ўсё адмовіцца ад прапаганды і падтрымкі гэтай, з дазволу сказаць, музыкі. Але ж культ «пігтродаў» дае нядрэнныя барышы. І знойдзена «арыгінальнае» выйсце: затычкі для вушэй! Парадаксальна, але факт: на канцэрты «пігтродавай» музыкі ў горадзе Нордбарту выканаўцам і слухачам былі раздадзены прыгожа афармленыя затычкі для вушэй. Слухайце, як кажуць, на здароўе! Прадпрымальныя прайдзісветы і тут пагрэлі рукі: яны хутка наладзілі масавы выпуск розных фасонаў затычак і ўвялі іх у моду.

П. КУШЧ.
(ТАСС).



РОДНЫЯ КРАЯВІДЫ. Чэрвеньская цішыня. Фота В. КРЭТАВА.

ДЭКАДА МЕДЫЦЫНСКІХ ФІЛЬМАЎ

19 чэрвеня ў нашай краіне адзначаецца Дзень медыцынскага работніка. У сувязі з гэтым святам у гарадах і вёсках рэспублікі з 15 па 25 чэрвеня праводзіцца шырокі паказ медыцынскіх і санітарна-асветных фільмаў.

У дні Дэкады на экраны выпускаюцца хранікально-дакументальныя і навукова-папулярныя кінастужкі, якія расказваюць аб прафілактыцы і лячэнні хвароб зроку і слыху, аб метадах даследавання хворых і дасягненнях медыцынскай навукі, аб шкоднасці алкаголю і курэння, аб неабходнасці захавання правілаў санітарыі і гігіены.

Шмат цікавага і павучальнага раскажуць стужкі «За жыццё асуджаных», «Аднаўленне сардэчнай мышцы», «Алкагольныя псіхозы», «Вінавата цыгарэта», «Ліпняя чарка», «Асцярожна, атрута!», «Пра пыл і пылінкі», «Як важна берагчы скуру», «Каб гэтага не здарылася», «Электронны кансіліум», «Кропля крыві».

У праграму Дэкады ўключаны таксама кінанарцыны на тэмы: «Анатомія і фізіялогія чалавека», «Інфекцыйныя і паразітарныя захворванні», «Хваробы унутраных органаў», «Шкоднасць знахарства і рэлігійных забабонаў», «Лекавыя расліны і прэпараты», «Арганізацыя аховы здароўя ў СССР і работа санітарнага актыву», «Ахова маці і дзіцяці ў СССР» і г. д.

Убачаць гледачы і новыя кінанарцыны. Сярод іх—«Эстафета здароўя» (аб ролі медыцынскіх работнікаў у барацьбе за высокую санітарную культуру), «Калі хочаш быць здаровым» (аб фізічнай культуры школьнікаў), «Паставцеся да гэтага сур'ёзна» (аб карыстанні заняткаў у гуртках таварыства Чырвонага Крыжа), «Усхваляванае сэрца» (аб прафілактыцы сардэчна-сасудзістых захворванняў), «Жыла-была пасіфлора» (аб лекавых раслінах), «Задацісты стафілакок» (аб прафілактыцы харчовых атручванняў) і іншыя.

На экранах рэспублікі будуць таксама дэманстравацца беларускія хранікально-дакументальныя і навукова-папулярныя кінастужкі «Па загаду сэрца», «Чарка гарэлкі», «Сэрца б'ецца зноў».

ТЭЛЕБАЧАННЕ

17 чэрвеня

Першая праграма. 16.45 — праграма перадач. 16.50 — для школьнікаў. «Школа пачынаючага спартсмена». На прыз «Скураны мяч» (М). 17.30 —для школьнікаў .«Наша прафесія — паліграфісты». Перадача з цыкла «Кім быць?» 18.00—тэлевізійныя навіны. 18.20—«Здароўе». Тэлевізійны часопіс. 19.05 — «Чорны аксаміт». Шырокаэкранны мастацкі фільм. 20.20 — «Эстафета навін» (М). 21.20 — на III Міжнародным конкурсе імя П. І. Чайкоўскага (М). 22.05— у эфіры — «Маладосць» (М). 22.55—па вашых просьбах. Канцэрт.

Другая праграма. 11.00 — «Панарама Радзімы» (М). 11.30 —«З Меркурыем на «ты». Перадача з Польшчы. 12.15—на III Міжнародным конкурсе імя П. І. Чайкоўскага (М). 17.30— «Веды». Навукова-пазнавальная праграма (М). 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.20 — як склалі песню (М). 19.00—эстрадны канцэрт.

18 чэрвеня

Першая праграма. 14.45 — праграма перадач. 14.50 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Мурзілкавы сябры» (М). 15.20 — для юнацтва. «Рэха вайны». Тэлевізійныя навелы (М). 16.30 — на III Міжнародным конкурсе імя П. І. Чайкоўскага (М). 17.00— на стадыёнах і спартыўных пляцоўках. Футбол. «Спартак» (М). — ЦСКА (М). У перапынку—тэлевізійныя навіны (М). 18.45 — «На агеньчык». Перадача з Куйбышава. 19.45—тэлевізійныя навіны (М). 20.00 — міжнародныя спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы памяці Кусачынскага. Перадача з Польшчы. 21.30 — тэлевізійныя навіны. 21.40 — «Нябесны ціхаход». Мастацкі фільм. 23.00— «Летнія мелодыі». Канцэрт лёгкай музыкі. Перадача з Румыніі.

Другая праграма. 18.30 —міжнародная сустрэча па баскетболу. БССР — Польшча. У перапынку — «Моладзь працягвае наступаць». Кінанарыс. 19.45 — «Браты навек». Дакументальны фільм. 20.55 — «Гучыць песня руская». Музычная перадача. 21.30 — «Старонкі вялікага мастацтва». Прэм'ера тэлевізійнага фільма (М).

19 чэрвеня

Першая праграма. 11.25 — праграма перадач. 11.30 — па музеях і выставачных залах. Рэпартаж з музея народаў Усходу. В'етнам (М). 11.55 — для школьнікаў. «Аперацыя «Сірыус-2». Перадача з Ленінграда. 12.40 — «Здароўе». Навукова-папулярная праграма (М). 13.30 — для воінаў Савецкай Арміі і Флоту. «Народны герой». Да 85-годдзя з дня нараджэння Г. І. Катоўскага (М). 14.00 — «Музычны кіёск» (М). 14.20—«Сельскі клуб». Перадача з Вільнюса. 15.20 — музычная шкатулка. 15.40 — «Белыя і чорныя». Тэлевізійны шахматна-шашачны клуб. 16.10 —«Снайпер Чэхаў жывы», «Гісторыя адной фатаграфіі». Кінанарысы. 16.50 — тэлевізійныя навіны (М). 17.05 — «Табе, юнацтва!» (М). 18.00 — клуб кінападарожнікаў (М). 19.00 — на стадыёнах і спартыўных пляцоўках. Трансляцыя на Маскву. У перапынку — тэлевізійныя навіны (М). 20.45 — міжнародныя спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы памяці Кусачынскага. Перадача з Польшчы. 21.30 — Х. Пенкоўст. «У Лейкв'ю...». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля (М). 22.45— канцэрт па заяўках медыцынскіх работнікаў.

Другая праграма. 18.00 — для дзяцей. «Матрос Чыжык». Мастацкі фільм. 19.20 — па роднай краіне. «Гэта мая зямля». «Пакуль няма плаціны». Кінанарысы. 20.10 — «Вячэрні канцэрт». Фільм-канцэрт. 21.00 —праграма кароткаметражных фільмаў па апавяданнях А. П. Чэхава («Нервы». «Тоўсты і тонкі». «Маска». «Конская прозвішча»). 22.45—канцэрт маладзёжнага самадзейнага ансамбля «Мірыца». Перадача з Кішынёва.

ТРЫЦЦАЦЬ РОЛЯЎ І АДНО ЖЫЦЦЁ

ТВОРЧЫ ПАРТРЭТ КІНААКТРЫСЫ ЛІДЗІІ СМІРНОВАЙ

ТРЫЦЦАТАЯ РОЛЯ

— Роля свацці ў нядаўна выпушчаным фільме «Жаніцьба Бальзамінава», — расказвае Лідзія Смірнова, — была маёй трыццатай роллю ў кіно. Хвалявалася вельмі! Бо гэта ж Астроўскі! А, трэба сказаць, я ніколі раней у кіно не іграла класіку.

Здавалася б, усё ўжо знойдзена, вывучаны драматург, яго эпоха. Старажытны горад Суздаль, дзе праходзілі здымкі, сам па сабе настройваў на лад мінулага стагоддзя, а вось чагосьці не хапала, і гэтае «штосьці» перашкаджала іграць, не давала ўпэўненасці ў выкананні ролі. Але памяць чалавечая, быццам казачны куфэрак: то, колькі ні мучся, ключа да яго не падбярэш, а то раптам нечакана і проста ён расчыняецца сам. Я ўспомніла, што неяк у гады вайны эшалон, у якім я ехала, трапіў пад бамбёжку. Цягнік спыніўся, людзі высыпалі хто куды. Хавацца. Адна ж жанчына кінулася на зямлю, закрыла сабою свае чамаданы. Калі самалёты адбамбіліся і паляцелі, я спытала яе, як можна так бязглузда рызыкаваць сваім жыццём. Жанчына паглядзела на мяне так, быццам рот яе быў набіты кашаю, у роспачы сказала:

—Ну, што я без сваёй чарнабуркі, ну што?

Такой старасветчынай і цёмнай сквапнасцю патыхнула ад гэтай бабы, што стала неяк нявесела і нялёгка на душы. Ну, вядома ж, маёй свацці як раз і не хапала вось гэтага жывёльнага тупаватага погляду, гэтага голасу, як рыпучая, маснічына, гэтай манеры вымаўляць словы.

РАЗВІТАННЕ З МАТЭМАТЫКАЙ

— У маленстве мяне, як і многіх, уладарна прыцягвала да сябе мастацтва. Але мары пра яго былі нейкія невыразныя. Пра работу актрысы я тады яшчэ і не задумвалася сур'ёзна, а калі паўстаў выбар, як жыць далей, паступіла ў Маскоўскі авіяцыйны інстытут, дзе не без поспеху правучылася цэлыя тры гады. Гэтыя гады былі пераломнымі ў жыцці. Роздум, ваганні, сумненні... Перамагла любоў да тэатра. Я падала дакументы адразу, на ўсякі выпадак, у тры акцёрскія навучальныя ўстановы — інстытут кінематаграфіі, Вахтангаўскае вучылішча, тэатральнае вучылішча пры маскоўскім Камерным тэатры. І вось сюрпрыз — прынята і ў інстытут кінематаграфіі, і ў Вахтангаўскае, і ў Камерны. Выбрала апошні. Чаму? Цяжка сказаць. Тады я толькі яшчэ намацвала ў мастацтве сваю сцежку.

— А як жа матэматыка, —пытаюся, — не шкада было расставацца з дакладнымі навукамі?

— Шкада, — адказвае актрыса, — але трэба ж калі-небудзь рабіць выбар. Неяк нядаўна адзін чалавек,— працягвае Смірнова, — не паверыў мне, што я была студэнткай авіяцыйнага інстытута, і прапанаваў рашыць адну задачу з галіны вышэйшай матэматыкі, праўда, не вельмі складаную. Калі я рашыла яе, ён быў прыемна здзіўлены...

Вучэнне ў Аляксандра Таірава дало Смірновай многа. Выдатны майстар рускага тэатра выхоўваў у сваіх вучняў высокі густ, шмат увагі звярталася на пластыку, сцэнічны рух, музычнасць, культуру сцэнічнай формы. Гэта была «вышэйшая матэматыка» акцёрскага майстэрства.

Калі тады вучобы засталіся ззаду, Лідзія Смірнова — адна з нямногіх студэнтаў — была пакінута для работы ў тэатры. Але лёс склаўся інакш.

ВАСЕМНАЦЦАЦЬ ПРЭТЭНДЭНТАК

Прэтэндэнтак на ролю галоўнай гераіні лірычнай камедыі «Маё каханне» было васемнаццаць. Усе — «блакітныя з блакітнымі вачыма». Калі Лідзію Смірнову зацвердзілі на гэту ролю, перад ёю ўзнікла новае пытанне — тэатр ці кіно. А Таіраў не прызнаваў «раздваення асобы». Так перад актрысаю адкрылася іншая дарога, дарога кіно, па якой яна з поспехам крочыць вось ужо дваццаць пяць гадоў.

— Нялёгка, напэўна, было пайсці з такога тэатра?

— Вядома, —адказвае Смірнова,— але хто хоць раз сур'ёзна «заразіўся» кінематографам, той ужо ніколі яму не здрадзіць. Назад дарогі не бывае... А тэатр, — працягвае актрыса, — без тэатра цяжка, на сцэне я працую да гэтага часу, хоць гэта і тэатр пры «Масфільме». Іграю ў спектаклях Тэатра-студыі кінаакцёра.

У спектаклі «Смерць Пазухіна» па п'есе М. Я. Салтыкова-Шчадрына, «Анджэла» па меладраме В. Гюго... Смірнова іграе розныя ролі, і гэта як нельга лепш гаворыць пра шырыню творчага дыяпазону актрысы, пра яе імкненне не замыкацца ў ролях пэўнага прывычнага плана, пра пастаянныя пошукі ў творчасці.

Роля Шурачкі (фільм «Маё каханне») прынесла ёй шырокую вядомасць. Гэта было першае знаёмства з цудоўным мастацтвам экрана. Наступная работа актрысы — Вара Бурліна ў карціне «Хлопец з нашага горада», пастаўленай па сцэнарыі Канстанціна Сіманава.

— Гэтыя ролі, як і іншыя ролі маіх сучасніц, — гаворыць актрыса, — былі мне надзвычай блізкія. Многае з таго, што перажывалі мае гераіні, я перажыла сама, і нярэдка лёс гераіні цесна злучаўся з маім лёсам.

Калі яна іграла Вару, прыйшло паведамленне пра тое, што муж яе прапаў без весткі. Вара ў карціне сустрэла свайго суджанага, а муж Лідзіі Мікалаеўны так і не вярнуўся з вайны...

Шмат роляў сыграла Смірнова за чвэртку стагоддзя работы ў кіно. Ролі гэтыя розныя — і падобныя, і непадобныя адна на адну. Гэта і сялянская дзяўчына Фенька ў карціне «Яна абараняе Радзіму» — ціхая, сарамлівая, няспрытная спачатку, яна паступова становіцца сабранай, мужнай, моцнай. Гэта і Флосі ў карціне «Серабрысты пыл» — няшчасная жанчына, якая ўсведамляе сваю чалавечую годнасць. Латышская дзяўчына Смайда ў фільме «У іх ёсць Радзіма», Мар'я ў фільме «Крутыя горкі» — бойкая, шумная, гарэзлівая, і разам з тым яна палымяна верыць у сваё шчасце. Юлія ў «Трое выйшлі з лесу» — натура цэласная, чыстая, шчырая. Насця ў «Тэлеграме» па вядомым апавяданні Канстанціна Паустоўскага, Елізавета Аляксееўна — «Імем рэвалюцыі»...

Адзін пералік усіх работ заняў бы немалы спіс — ролі розныя, але іх збліжае адно: натуральнасць, праўдзівасць у выкананні, поўная знітаванасць з вобразам, якую цяжка назваць «ігрою». І, здаецца, Смірнова не іграе, яна жыве гэтым вобразам, ён для яе такі ж рэальны, як і людзі, што жывуць на зямлі. Ёсць у актрысы ролі больш удалыя і менш удалыя, так, напэўна, бывае ў кожнага мастака. Але няма ў яе бяздушных, халодных роляў — яна не ўмее, не можа іграць раўнадушна, загараецца роллю, аддае ёй усю сябе.

А. ЛУПЕНКА,
кінакрытык.
(АДН).

Літаратура і мастацтва 4
Пятніца, 17 чэрвеня 1966 года.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-22-04, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, карэспандэнцкага пункта ў Гомелі — 2-70-83, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-97-44.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Друкарня выдавецтва «Звязда».
Індэкс 63856. АТ 00968